Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СНЕЖНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 245 (27610) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

*По надзею, па радасць, па шчасце!*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

Адыходзячы год адлічвае апошнія хвіліны... Зусім хутка мы збяромся разам са сваімі роднымі і блізкімі, каб аддзячыць яму за ўсё добрае і пад бой курантаў падняць келіхі за год надыходзячы. На некалькі імгненняў мільёны людзей з'яднаюцца ў адзіным парыве, адзіным памкненні — данесці да нябёсаў свой самы важны пасыл.

Мы адкінем усё дробязнае і другараднае, каб у навагоднюю ноч засяродзіцца на галоўным. Што гэта будзе? Здароўе, каханне, прызнанне, грошы?.. Даўгалецце бацькоў, уладкаванасць дзяцей, паразуменне з блізкімі, памнажэнне дабрабыту?

У гэты момант кожны падумае пра сваё, але ўсе мы — маладыя і сталыя, мудрыя і наіўныя, акрыленыя і прыземленыя, вернікі і атэісты — будзем марыць пра цуд. Той самы цуд, які пасылаецца не ў якасці ўзнагароды за добрыя паводзіны, а проста так, без усялякіх умоўнасцяў. І тады...

Звычайны гарбуз ператвараецца ў карэту, сціплае адзенне — у каралеўскія строі, двухпакаёўка — у палац... Злыя становяцца добрымі, скваплівыя — шчодрымі, бедныя — багатымі, а дурні — разумнымі...

У прынцыпе, нічога невыканальнага і нерэальнага ў нашых жаданнях няма.

Толькі чамусьці вельмі хочацца, каб над іх увасабленнем «папрацаваў» нехта іншы — дзесьці там, у іншым вымярэнні. І потым «явіў» нам цуд.

...Апошнія хвіліны адыходзячага года. Мы запальваем свечкі і загадваем жаданні, выдатна разумеючы, што прыкладаць намаганні для іх увасаблення давядзецца самім.

Пакуль жывём, мы вучымся быць чараўнікамі і рабіць тое, што ў нашых сілах, — для сябе, для блізкіх, для знаёмых і незнаёмых людзей. А ў выніку адбываюцца цуды — самыя сапраўдныя, зямныя... Верце ў іх і заўсёды спадзявайцеся на лепшае! Менавіта гэтага, дарагія чытачы, зычаць вам у Новым годзе супрацоўнікі «Звязды» і героі нашага святочнага нумара.

*Каляды...*
*Святы*
*ў шумным*
*карагодзе...*
*Прыждалі мы*
*Чароўнае пары —*

*Зноў Новы год...*
*А што?*
*Няхай прыходзіць!*
*Адно —*
*хай будзе лепшы,*
*чым стары!*

*Валянціна ДОЎНАР.*

ISSN 1990 - 763X

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «Дзеці застаюцца прыярытэтам у сацыяльнай палітыцы дзяржавы»

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў 30 снежня, наведваючы Гарадскі дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Пралеска» ў аграгарадку Ракаў Валожынскага раёна, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**


Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з жылой і лячэбнай базай дзіцячага цэнтра і арганізацыяй яго работы, з цеплынёй паразмаўляў з хлопчыкамі і дзяўчынкамі, павіншаваў іх з навагоднімі святамі і ўручыў падарункі: настольныя гульні, упрыгажэнні для пакоя, ласункі. Акрамя таго, цяпер дзеці змогуць паглядзець любімыя мультфільмы і казкі з дапамогай новага дамашняга кінатэатра.

Аляксандр Лукашэнка з малодшым сынам Мікалаем прыняў удзел у дзіцячым навагоднім свяце і разам з маленькімі пацыентамі цэнтра павадзіў карагод. Яшчэ адным сюрпрызам стала выступленне артыстаў Белдзяржцырка, вялікі святочны торт ад Прэзідэнта і навагодняе чаяпіцце.

Хлопчыкі і дзяўчынкі таксама павіншавалі кіраўніка дзяржавы з надыходзячым Новым годам і ўручылі падарунак ад дзяцей горада Мінска, а адна з дзяўчынак падарыла Аляксандру Лукашэнку сваю карціну, на якой адлюстравана казачная птушка шчасця.

Дзіцячы санаторый «Пралеска» для дзяцей з захворваннямі стрававання і дыхання адкрыты ў 1987 годзе. У красавіку 2005 года ён перайменаваны ў Гарадскі дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Пралеска». Зусім нядаўна ва ўстанове завершана рэканструкцыя матэрыяльнай базы.

Цяпер у цэнтры функцыянуюць тры аддзяленні на 180 ложкаў для дзяцей з захворваннямі органаў дыхання, стрававання, зроку.

Прыбыўшы ў дзіцячы цэнтр, кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, наколькі паслугі гэтага і іншых такіх устаноў запатрабаваны. Міністр аховы здароўя Васіль Жарко далажыў, што ў гэтым цэнтры створаны ўсе ўмовы для лячэння і рэабілітацыі дзяцей, і ён, несумненна, патрэбны.

«Мы, вядома, для дзяцей шкадаваць нічога не будзем, але празмернасцяў быць не павінна. Дзяржава не можа на сябе браць празмерную нагрузку, — сказаў Прэзідэнт. — Калі трэба кагосьці рэабілітаваць, аднавіць сілы пасля хваробы, лячыць, гэта трэба рабіць, але празмернага ні ў сферы аховы здароўя, ні ў сферы адукацыі быць не павінна».

Гаворачы аб дзяржаўных расходах на сацыяльную сферу, Аляксандр Лукашэнка згадаў аб увядзенні так званага транспартнага падатку. «Калі трэба недзе пляча падставіць, тады пачынаюць... «Мерседэс» купіў за $100 тыс., а падатак транспартны заплаціць (каля $70), каб дарогі добрыя былі, не можам», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Трэба ж разумець, што гэта вялікія грошы», — падкрэсліў Прэзідэнт, адзначыўшы, што толькі на рэканструкцыю дзіцячага цэнтра «Пралеска» патрачана каля Br110 млрд. «Дзе трэба — там трэба. І ўсё гэта неабходна ў наступным годзе аптымізаваць. Як бы ні было складана, цяжка, колькі трэба для дзяцей — гэта прыярытэт. У першую чаргу дзеці. Потым усё астатняе», — дадаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўказаў на неабходнасць кадравай аптымізацыі з-за даволі вялікіх суадносін абслугоўвага персаналу і колькасці пацыентаў. «З вас і пачнём аптымізацыю ў сферы аховы здароўя і адукацыі. Трэба загрузіць людзей і даць ім нармальную зарплату, або яны сапраўды разбягуцца ўсе па Расіі ці яшчэ недзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да губернатара Мінскай вобласці Сямёна Шапіры.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, кіраўнікам лячэбных устаноў неабходна прадаставіць права пакінуць у арганізацыях столькі работнікаў, колькі неабходна, пры захаванні існуючага фонду зарплаты. «Калі ласка, хоць адзін працуй, але павінен быць вынік. Вось твае грошы — дзялі. А з міністэрскага кабінета нічога не раздзеліш. Тады яны будуць цаніць і лічыць гэтыя грошы і да нас прэтэнзій не будуць прад'яўляць», — адзначыў беларускі лідар.

Звяртаючыся да чыноўнікаў, Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў не чакаць дадатковых нарматыўных актаў, а дзейнічаць: «Першы квартал пройдзе — пагляджу».

Васіль Жарко адзначыў, што за год у сферы аховы здароўя ўжо на 1,4 тыс. скарочана колькасць работнікаў. Гэта ў першую чаргу закранула інжынерныя і кадравыя службы, бухгалтараў і эканамістаў.

# СВЯТА Ў ВЯЛІКАЙ СЯМ'І

**Дзіцячы дом №6 горада Мінска асаблівы. Дзякуючы педагагічнаму калектыву, які ўзначальвае Тамара Саўчанка, тут створана такая атмасфера, што словазлучэнне «сацыяльная ўстанова» не надта падыходзіць. Тут смачна пахне, дзеці не адрозніваюцца ад «дамашніх», а твары дарослых мяккія і спакойныя. Пяць гадоў таму «Звязда» разам з гэтым дзіцячым домам ладзіла акцыю «Дзеці — самы дарагі госць у доме» па ўладкаванні яго выхаванцаў у сем'і. Некалькі малых знайшлі сабе новых бацькоў.**

А ўчора ў гэты дзіцячы дом у рамках акцыі «Нашы дзеці» прыехаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КАБЯКОЎ**. І... нічога амаль не змянілася, ніякага залішняга напружання ў сценах гэтага тыпавога будынка не ўзнікла. Гэтак жа смачна, па-дамашняму пахла, хлопчыкі жвава абмяркоўвалі перамогу мінскага «Дынама» над ніжагародскім «Тарпеда», а маленькія дзяўчаткі-сняжынкі ў ружовых і блакітных сукенках, расшытых срэбнымі ніткамі, употай зазіралі ў твары незнаёмых гасцей.

А вось Андрэю Уладзіміравічу давялося на паўгадзіны забыць пра высокую пасаду і ўзрост і разам з дзецьмі вадзіць карагод, спяваць песні і нават... рабіць жартоўную зарадку пад музыку. Затое потым былі падарункі, усмешкі, словы падзякі. Акрамя кардонных казачных замкаў, напоўненых цукеркамі, дзеці атрымалі вялікі тэлевізар і магутны камп'ютар, але галоўнае — добры, перадсвяточны, настрой і шчырыя пажаданні.

— Ужо амаль 20 гадоў доўжыцца акцыя «Нашы дзеці», — сказаў потым журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Сёлета больш за 200 сацыяльных устаноў адукацыі наведваюць прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікі прадпрыемстваў, банкаў. Мэта, перш за ўсё, — зрабіць так, каб дзеці, якія тут жывуць, адчулі свята не менш, чым тыя, хто жыве ў сям'і. Важна, каб усе яны атрымалі падарункі, і не толькі цукеркі. Матэрыяльна дзеці, якіх апякае дзяржава, павінны быць не менш забяспечаны, чым тыя, якіх выхоўваюць бацькі. Ды і мы, хто прыязджае ў гэтыя дні да дзяцей, атрымліваем добрыя эмоцыі, далучаемся да атмасферы свята, па-добраму хвалюемся і згадваем уласнае дзяцінства.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


Фота БЕЛТА.

У сувязі са святам наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе 4 студзеня 2014 года.

# КАБ ВЯРНУЦЦА Ў РОДНЫ ДОМ...

**Старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый Лукашэнка разам з сям'ёй у рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» наведаў сацыяльна-педагагічны цэнтр Салігорскага раёна. Для трынаццаці выхаванцаў цэнтра гэтая падзея стала сапраўдным навагоднім сюрпрызам.**

Увага вельмі важная для ўсіх дзяцей, а для гэтых — асабліва. Многія з іх сёлета ўпершыню апынуліся на навагоднім ранішніку і атрымалі салодкія падарункі. Сюды трапляюць дзеці з праблемных сем'яў. Але мэта цэнтра — не знайсці дзецям новых бацькоў, а вярнуць іх у родны дом.

«Мы дапамагаем бацькам нашых выхаванцаў. Камусьці — працаўладкавацца, камусьці — прайсці лячэнне, — распавядае дырэктар цэнтра Жанна Цярэшка. — І ў 65% выпадкаў дзеці зноў вяртаюцца дамоў. Астатнім шукаем прыёмную ці апякунскую сям'ю. Менавіта так! Не сем'ям падбіраем дзяцей, а наадварот».

Як кажа дырэктар цэнтра, ужо трынаццаць гадоў, з самага пачатку, тут працуюць шчырыя і чулліва людзі, якія да сваіх падапечных ставяцца як да родных. Напэўна, таму ўвесь ранішнік усмешлівыя дзеці сціпла лашчыліся да сваіх выхавальнікаў.

Фота БЕЛТА.


Для гасцей і выхаванцаў цэнтра пераможцы раённага этапу рэспубліканскага конкурсу «Ёлка-фэст» арганізавалі тэатралізаванае прадстаўленне. Дзмітрый Лукашэнка разам з жонкай і дочкамі далучыўся да святкавання. Усе дарослыя на гэтыя імгненні вярнуліся ў дзяцінства: вадзілі карагод, танцавалі, разам з Дзедам Марозам і Снягуркай «запальвалі» прыгажуню ёлку. Пасля спектакля ўсе прысутныя сабраліся за салодкім святочным сталом. Дзмітрый Лукашэнка ўручыў выхаванцам цэнтра падарункі — тэлевізар з DVD-плэерам і цукерачныя сюрпрызы — і пажадаў, каб у новым годзе ўсе мары абавязкова ажыццявіліся. «Зычу здароўя, поспехаў. Памятайце, што вы важныя і патрэбныя».

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**
*Мінск — Салігорск — Мінск.*

# КРЫХУ ЦЯПЛА ПАД НОВЫ ГОД

**Учора памочнік Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка са сваёй сям'ёй прыехаў у аддзяленне дзіцячага сацыяльнага прытулку Смалявіцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, каб падарыць яго выхаванцам часцінку сямейнага свята.**

...Маленькі Ванечка не можа ўсядзець на месцы і ўсё парываецца паскакаць каля прыбранай ёлкі, тым больш што ўжо на ўсю моц гучыць вясёлая музыка. Худзенькая Мальвіна з раскошнымі блакітнымі валасамі прытанцоўвае і прытупвае абцасікам. І хоць візіт Віктара Аляксандравіча і яго сям'і сюды зусім прыватны, педагогі цэнтра, напэўна, хвалююцца, але, вядома, не падаюць выгляду. Затое дзятва весела перагаворваецца і бесклапотна смяецца ў прадчуванні свята.

І ўжо праз некалькі хвілін яно надыходзіць. Дзед Мароз са Снягуркай загадваюць дзецям загадкі, а тыя хорам радасна крычаць адказы. А тут і чарга карагода, які ўсе, дружна ўзяўшыся за рукі, пачынаюць вадзіць вакол святочна ўбранай лясной прыгажуні. Малыя з захапленнем скачуць і смяюцца, старэйшыя дзяўчаткі спачатку трохі саромеюцца, але ўжо праз некалькі хвілін першае пачуццё нясмеласці праходзіць, і вось ужо Мальвіна весела вытанцоўвае нешта накшталт бугі-вугі разам з жонкай Віктара Лукашэнкі Ліліяй Валер'еўнай.

Самыя маленькія з цікаўнасцю пазіраюць на падарункі, а сёй-той нават торкае ў іх пальчыкам. Неўзабаве пачынаецца іх уручэнне. Твары малых радасна ўспыхваюць, бо кожны з іх атрымаў менавіта той падарунак, які заказваў, а ў дадатак яшчэ заплечнік у выглядзе коніка — з цукеркамі.

...13-гадовая Ангеліна прыціскае да грудзей свой падарунак і кружыцца з ім пад успышкі фотаапаратаў і камер, нібы фотамадэль. Пакрыўджаных няма. А сацыяльна-педагагічны цэнтр у цэлым атрымлівае ў падарунак фарбы, алоўкі, фламастары, кошыкі з садавінай і пячэннем і мыйны пыласос.

Дарэчы, у дзіцячы сацыяльны прытулак трапляюць дзеці, якіх забралі з сям'і, у асноўным з-за п'янства іх бацькоў. Знаходзіцца тут яны могуць да паўгода. За гэты час бацькам дапамагаюць пачаць весці нармальны лад жыцця: накіроўваюць на лячэнне ад алкагалізму, працаўладкоўваюць, дапамагаюць з рамонтам дома або кватэры.

— І звыш 60% нашых выхаванцаў вяртаюцца ў свае родныя сем'і, — у голасе дырэктара Смалявіцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра Таццяны Говар адчуваецца гонар. — Астатнім дзеткам шукаем замяшчальныя сем'і. І мы не адправілі ў інтэрнат ніводнага дзіцяці за гэтыя апошнія 4 гады!

**Святлана БУСЬКО.**

Фота БЕЛТА.


## ШЧЫРАЕ ДЗЯКУЙ ЗА ДАБРО І ЧАЛАВЕКАЛЮБСТВА

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 28 снежня накіраваў зварот Мітрапаліту Філарэту, пачэснаму Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі са словамі павагі і ўдзячнасці. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Усё Ваша жыццё — сведчанне адданасці адной і назаўсёды выбранаму шляху — служэнню Богу і людзям, пропаведзі спрадвечных каштоўнасцяў веры, любові, міласэрнасці», — гаворыцца ў звароце. — Трыццаць пяць гадоў Вы ўзначальвалі Беларускую праваслаўную царкву. Для Вас гэта былі складаныя і цікавыя гады, напоўненыя нястомнай працай і малітвай. Менавіта вы сталі ля вытокаў адраджэння праваслаўя ў Беларусі. Пад вашым архіпастарскім кіраўніцтвам ствараліся сотні праваслаўных прыходаў, будаваліся новыя цэрквы і рэстаўраваліся гістарычныя святыні, адкрываліся духоўныя семінарыі і нядзельныя школы. Асаблівую ўвагу вы ўдзялялі выхаванню традыцый хрысціянскай маралі, захаванню духоўнай і культурнай спадчыны беларускага народа».

«Сёння праваслаўная царква з'яўляецца самай масавай і аўтарытэтнай рэлігійнай арганізацыяй нашай краіны. Несумненна заслуга ў тым паспяховым і плённым яе развіцці належыць вам, першаму ў гісторыі Экзарху Беларускай праваслаўнай царквы. Вы сталі для многіх пакаленняў свяшчэннікаў і вернікаў унікальным прыкладам адданасці сваёй справе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з цеплынёй і любоўю ўспамінае сустрэчы і размовы з Мітрапалітам Філарэтам. «Для мяне вы былі і застаецеся мудрым настаўнікам, добрым сябрам і дарадчыкам. І я зноў і зноў гатовы захапляцца вашым аптымізмам, жыццялюбствам і цудоўным пачуццём гумару», — гаворыцца ў звароце.

«Беларускія грамадзяне аднадушныя ў прызнанні Вашых заслуг і шчыра ўдзячныя за ўсё зробленае для нашага народа. Упэўнены, што Вы і ў далейшым будзеце садзейнічаць умацаванню спакою і сацыяльнай стабільнасці ў грамадстве, абуджэнню ў сэрцах дабра і чалавекалюбства», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

## Захаваць традыцыі супрацоўніцтва дзяржавы і праваслаўнай царквы

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 28 снежня павіншаваў Мітрапаліта Паўла з зацвярджэннем на пасадзе Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Праваслаўная царква з'яўляецца вядучай канфесіяй нашай краіны, уносіць значны ўклад у захаванне і ўзбагачэнне духоўных і маральных традыцый беларускага народа. У Беларусі склаліся сапраўды партнёрскія дзяржаўна-царкоўныя адносіны, вядзецца зацікаўлены, канструктыўны дыялог, накіраваны на вырашэнне важнейшых сацыяльных пытанняў грамадства», — гаворыцца ў віншаванні.

«Вы маеце багаты вопыт работы ў праваслаўных прыходах, размешчаных у розных краінах, карыстаецеся аўтарытэтам і павагай сярод свяшчэннаслужыцеляў і вернікаў. Упэўнены, што на высокай пасадзе кіраўніка Беларускага Экзархата Вы зробіце ўсё магчымае для захавання і развіцця традыцый супрацоўніцтва дзяржавы і царквы, будзеце актыўна садзейнічаць умацаванню стабільнасці, згоды і міру ў беларускім грамадстве», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

## НЕПАРЫЎНАЯ СУВЯЗЬ ГІСТОРЫІ

Да 95-годдзя ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі

ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!

Сардэчна віншую вас са знамянальнымі датамі — 95-годдзем утварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі.

Для нашай краіны гэтыя падзеі азнаменавалі змену эпох і заклалі фундамент будучага суверэнітэту. У тыя далёкія гады ўпершыню ў гісторыі было абвешчана права народаў на самавызначэнне і беларусы набылі сваю нацыянальную дзяржаву.

Гісторыя станаўлення і развіцця БССР непарыўна звязана з Камуністычнай партыяй. У гады Вялікай Айчыннай вайны камуністы, захапляючы сваім прыкладам мільёны людзей, ішлі ў авангардзе барацьбы з ворагам. Пад іх кіраўніцтвам у кароткія тэрміны адрадзіліся гарады і вёскі, рэспубліка набыла магутны навуковы і вытворчы патэнцыял.

Мы беражліва захоўваем лепшыя традыцыі тых гадоў. Суверэнная Беларусь упэўнена ідзе па выбраным народам шляху развіцця, у аснове якога ідэалы міру, узаемадапамогі і сацыяльнай справядлівасці, закладзеныя папярэднімі пакаленнямі.

Шчыра жадаю вам, дарагія суайчыннікі, моцнага здароўя, новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## Спачуванні Прэзідэнту і народу Расіі

**Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну, родным і блізкім загінулых у выніку тэрарыстычных актаў у Валгаградзе. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«У Рэспубліцы Беларусь з глыбокім смуткам успрынялі трагічныя паведамленні аб гібелі людзей у выніку тэрарыстычных актаў у Валгаградзе», — гаворыцца ў спачуванні.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь самым рашучым чынам асуджае любыя праявы тэрарызму, а асобам, якія ажыццявілі гэтыя бесчалавечныя ўчынкі, няма апраўдання.

## ІНІЦЫЯТЫВА НЕ КАРАЕЦЦА

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч заявіў учора падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Лепшы прадпрымальнік 2012 года», што прадстаўнікам малога і сярэдняга бізнесу трэба быць больш актыўнымі і ініцыятыўнымі.**

Кіраўнік урада адзначыў, што сёння ў многіх вядучых краінах, такіх як Германія, ЗША, прадпрымальніцтва з'яўляецца асноўнай эканомікі. У гэтых і многіх іншых дзяржавах малы і сярэдні бізнес фарміруе звыш 60% валавога ўнутранага прадукту. «У нас пакуль такіх вынікаў няма, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Сёння, нягледзячы на тое, што пазітыўныя тэндэнцыі маюць месца, у цэлым малы і сярэдні бізнес у ВУП складае крыху больш за 24%». Таму патрэбна развіццё. Прычым не толькі сферы аказання паслуг або гандлю (хоць гэта, безумоўна, таксама важныя напрамкі), але і прадпрымальніцтва ў сферы вытворчасці і вытворчых паслуг. «Тут мы капітальна адстаём, і я хацеў бы, каб вы былі больш актыўнымі», —сказаў прэм'ер. Па яго словах, урад гатовы аказваць падтрымку: «Калі трэба, будзем вырашаць пытанні, звязаныя з зямельнымі ўчасткамі, прымаць дадатковыя рашэнні па перадачы ва ўласнасць у вызначаным парадку памяшканняў, якія арандуюцца». У 2013 годзе толькі 144 арандатары сталі ўласнікамі плошчаў, на якіх яны працуюць. «Гэта вельмі мала», — упэўнены прэм'ер-міністр.

Рэспубліканскі конкурс «Лепшы прадпрымальнік года» праводзіцца ў мэтах папулярызацыі прадпрымальніцтва, павышэння дзелавой актыўнасці і прафесіяналізму суб'ектаў прадпрымальніцтва. Сёлета пераможцамі і лаўрэатамі конкурсу сталі 48 юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Надвор'е

## З МОКРЫМ СНЕГАМ І ДАЖДЖОМ

**Анамальна цёплае надвор'е ў нашай краіне захаваецца і на святы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

У аўторак 31 снежня чакаецца воблачнае надвор'е з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах магчымы мокры снег і дождж. Месцамі туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. І ў першы дзень новага года характар надвор'я істотна не зменіцца. Часам невялікія ападкі (мокры снег і дождж), месцамі туман і галалёдзіца на дарогах.

Тэмпература паветра ў галоўную ноч года будзе ад 5 марозу да 1 цяпла. Удзень 1 студзеня — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Незвычайна цёплае надвор'е захаваецца ў нас 2 і 3 студзеня. Праўда, кароткачасовыя ападкі будуць ужо ў выглядзе снегу і мокрага снегу. Месцамі туман і галалёдны з'явы. Уначы — да 5 марозу, а ўдзень каля нуля. Такі тэмпературны фон на 3-6 градусаў вышэйшы за кліматычную норму. Вось нам і глабальнае пацяпленне на практыцы...

**Сяргей КУРКАЧ**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00, тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3-х лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

- ул. Чичурина, д. 6 – 10 мес., ул. Чичурина, д. 12 – 11 мес., ул. Чичурина, д. 14 – 18 мес., ул. Чичурина, д. 18 – 17 мес., ул. Чичурина, д. 20 – 27 мес., пр-т газеты «Правда», д. 3 – 24 мес., ул. Панченко, д. 10 – 11 мес., ул. Панченко, д. 10А – 12 мес., ул. Матусевича, д. 56 – 23 мес.

**Объединение осуществляет строительство объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 36 по генплану.**

Свидетельство (удостоверение) № 500/1109-5600 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 25 сентября 2013 года.

Земельный участок площадью 1,5289 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Жилой дом запроектирован 10-этажным, состоит из 4 секций, имеет техническое подполье и теплый чердак. Количество квартир – 159. Квартиры имеют лоджии, которые с шестого и выше этажей используются для второго пути эвакуации (люки с наружными лестницами). Под лоджиями квартир первого этажа предусмотрены погреба. На первом этаже в секции в осях 3-4 расположены помещения товарищества собственников с отдельным входом.

Начало строительства жилого дома – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – июль 2014 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 29.02.2012 № 7-60/12 с дополнением № 7-60/12а от 30.04.2012.

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить на строительство квартир №№ 1, 2, 3, 5, 6, 7, 9, 10, 11, 13, 14, 15, 17, 18, 19, 21, 22, 23, 25, 26, 27, 29, 30, 31, 33, 34, 35, 37, 38, 39.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

15 085 929 руб. – на 1-комнатные квартиры;
14 776 022 руб. – на 2-комнатные квартиры;
14 466 116 руб. – на 3-комнатные квартиры.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Договор строительного подряда от 07.10.2013 № 145с-10-13, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*Генеральный директор* *Н.В. Милошевский*



**Извещение о проведении повторного открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены**

**Предмет аукциона № 1 –**

# НЕДВИЖИМОЕ ИМУЩЕСТВО (производственная база),

**расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 1-й км,**

В СОСТАВ КОТОРОГО ВХОДЯТ СЛЕДУЮЩИЕ ЗДАНИЯ И СООРУЖЕНИЯ:

- капитальное строение (весовая автомобильная), инв. № 110/С-86078, площадь – 200,3 кв.м;
- капитальное строение (весовая), инв. № 110/С-86095, площадь – 10 кв.м;
- капитальное строение (гаражи), инв. № 110/С-57233, площадь – 313,3 кв.м;
- капитальное строение (закрытый склад), инв. № 110/С-2093, площадь – 5402,5 кв.м;
- капитальное строение (канализационно-насосная станция), инв. № 110/С-86094, площадь – 18 кв.м;
- капитальное строение (контрольно-пропускной пункт), площадь – 9 кв.м, инв. № 110/С-86076;
- капитальное строение (котельная), инв. № 110/С-86093, площадь – 222 кв.м;
- капитальное строение (открытый склад), инв. № 110/С-2092, площадь – 9286 кв.м;
- капитальное строение (пост охраны), инв. № 110/С-99750, площадь – 7,7 кв.м;
- капитальное строение (склад ГСМ), инв. № 110/С-86066, площадью – 32 кв.м;
- капитальное строение (склад хранения баллонов), инв. № 110/С-1607, площадью – 32,2 кв.м;
- капитальное строение (цех услуг), инв. № 110/С-86090, площадью – 641 кв.м;
- капитальное строение (склад), инв. № 110/С-99753, площадью – 96,5 кв.м;
- капитальное строение (туалет), инв. № 110/С-99712, площадью – 1,1 кв.м;
- изолированное помещение (помещение закрытой встроенной трансформаторной подстанции), инв. № 110/D-2752689, площадью 52,5 кв.м;
- изолированное помещение (административно-торговое помещение), инв. № 110/D-2752692, площадью – 2155,9 кв.м;
- высоковольтная кабельная линия, инв. № 110/С-99804;
- высоковольтная кабельная линия, инв. № 110/С-99806;
- внеплощадочные теплосети, инв. № 110/С-99762;
- внеплощадочные сети канализации, инв. № 110/С-99803;
- внеплощадочные сети хозяйственной канализации, инв. № 110/С-100009;
- внутриплощадочное электроснабжение, инв. № 110/С-99759;
- внутриплощадочные слаботочные сети, инв. № 110/С-99760;
- кабельная линия 0,4 кВ, инв. № 110/С-99757;
- кабельные линии связи, инв. № 110/С-99772;
- наружные сети водопровода, инв. № 110/С-99854;
- наружные сети канализации, инв. № 110/С-99764;
- наружные сети теплоснабжения, инв. № 110/С-99763.

Недвижимое имущество (производственная база) находится на земельном участке с кадастровым номером 141000000001000711.
Начальная цена **предмета аукциона № 1** – 9 418 154 000 рублей без НДС.
Сумма задатка – 941 815 400 рублей.

Продавец имущества – **ОАО «Барановичиметаллоптторг»** (225320, Брестская обл., г. Барановичи, Слонимское шоссе, 1-й км).

Организатор аукциона – **УП «Комплекс Консалт»** (г. Минск, ул. Лынькова, 77-14).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели, заключившие или имеющие возможность заключения договоров безвозмездного пользования государственным имуществом (наружные сети водопровода, помещение пожарной обороны «убежище»), заключившие соглашение с организатором аукциона о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона, внесшие задаток и предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с предметом аукциона, копию свидетельства о госрегистрации (для юрлиц и ИП), копию Устава (для юрлиц), копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также договор безвозмездного пользования государственным имуществом, заключенный ранее, или письменное согласие ссудодателя на заключение договора безвозмездного пользования государственным имуществом, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона. Задаток вносится в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, по каждому из предметов аукциона, на которые регистрируется заявитель, на р/с УП «КОМПЛЕКС КОНСАЛТ» № 3012095930001 в ОАО «Технобанк» г. Минск, код 182, УНП 190454930.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) в порядке, предусмотренном договором купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости приобретенного имущества в соответствии с порядком проведения аукциона.

**Аукцион проводится 11 января 2014 года в 13.30 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Заявления и документы, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются до 10 января 2014 года включительно в рабочие дни с 11.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, пр. Дзержинского, 104-501. Срок окончания подачи заявлений – 10.01.2014 г. до 13.00.**

**Телефоны для справок: (017) 271 09 23, (029) 6 922 644.**

# ПРА ЧАРОЎНЫ КРАНІК І НЕ ТОЛЬКІ

**На сённяшні дыялог мы ўзялі з сабою... стос «жыровак». Сталы эканомны дзядзька і малады марнатравец (у разумных межах) вырашылі на прыкладзе сваіх выдаткаў на кватэры высветліць, хто з іх сёлета быў больш гаспадарлівым. Нам здаецца, што ашчаджаць кожную капейку на ўласным прыкладзе ў Год беражлівасці было не сорамна.**

## Гарачая кропка

**У. К.** — «Паперкі» ад ЖЭСа ў нас, мабыць, і аднолькавыя, аднак я бачу, што квадратура вашай двухпакаёўкі, у адрозненне ад маёй, значна большая. Во, у мяне стандартныя 44 квадратныя метры, а ў вас — ажно 67. Але ж зараз паглядзім, чым адгукаецца вам у «жыроўцы» тая дадатковая радасць.

**С. К.** — Згодны. Выкладаем паперкі на стол і падлічваем расходы. Так, па тэхабслугоўванні і адлічэнні на капрамонт тарыф у нас аднолькавы, а вось метры розныя. Тут я табе прайграю: мінус 22 тысячы... О! А трэцім радком ідзе ацяпленне. У мяне — 43 тысячы за мінулы лістапад, а ў цябе — ужо 58. Гэта пры тым, што кватэра ў мяне большая.

**У. К.** — Дайце сам гляну. Дакладна. А чаму ж так атрымалася?

**С. К.** — У цябе, кажаш, дом якога года пабудовы, 1975-га? Ну. А майму дому ўсяго 6 гадоў. Зразумеў? Ён значна цяплейшы, чым твой. У нас, наколькі я ведаю, у кожным пад'ездзе лічыльнік цяпла існуе. У тваім доме добра, калі адзін лічыльнік на ўсю пабудову ёсць.

**У. К.** — Што вы лухту нейкую вярзеце? Нармальны ў мяне дом. Мы не мерзнем. Нават у невялікі мароз трымаем на мікраправетрыванні шклопакеты. А часам і цалкам вокны адчыняем, бо немагчыма вытрымаць, як паляць батарэі!

**С. К.** — Не зразумеў. А навошта табе такія гарачыя батарэі рабіць? У мяне на кожнай батарэі спецыяльны кранік ёсць, таму, калі на вуліцы цёпла, я падачу цяпла ў батарэю рэгулюю. Дакладней, я гэты кранік гадоў пяць таму як адрэгуляваў, каб у кватэры была камфортная тэмпература (22-25 градусаў), так яго больш і не чапаю.

**У. К.** — І што з той «рэгуляцыі»? Вам ад яе ўсё роўна ніякай выгады. Ну менш будзе цяпла. А заплаціце столькі ж.

**С. К.** — Як гэта «ўсё роўна»? У мяне ж, акрамя краніка, на батарэі і лічыльнік цяпла ёсць. Калі гэтая «жалезка» менш пячэ, то і лічыльнік не так хутка «круціцца». Адразу мы, на жаль, плацім па-сярэдняму. Потым, па выніках сезона, спецыялісты паказанні з гэтага лічыльніка здымаюць і робяць пераразлік. Таму, хто цяпло эканоміў, работнікі ЖЭСа пэўную суму грошай вяртаюць. Вось паглядзі. У ліпені мне за мінулы сезон пераразлік па ацяпленні зрабілі. У тым месяцы я на 64 тысячы рублёў менш па жыроўцы і заплаціў. Дробязь, але прыемна. А вось тыя, хто гэтым спецыяльным кранікам у нашым доме не карыстаўся, а потым ад спякоты вокны адчыняў, у ліпені добрыя грошы даплачвалі. Скажу больш: мне работнікі эксплуатацыйнай службы казалі, што сама прысутнасць гэтых цудакранікаў дазволіла дому недзе на 30% менш цяпла спажываць, таму нават зімой мы па-сярэдняму менш плацілі. Гэта ўжо не проста эканомія майго кашалька, але, відаць, і ўсёй дзяржавы.

**У. К.** — Падабаюцца мне вашы кранікі. Можа, у вас ёсць пара лішніх? Не пазычыце? І дарэчы: дзе ўзяць лічыльнікі для батарэй? Першы раз пра іх чую.



Фота Тараса ШЧЫРАГА



**С. К.** — Я ж табе казаў: дом наш новы. Гэтае абсталяванне тут адразу было. Я думаю, што асобна ад іншых жыхароў свайго дома ты такі кранік на батарэю не паставіш, ды і лічыльнік таксама. Ты спачатку ўдакладні, ці ёсць асобны лічыльнік цяпла ў вашым пад'ездзе і доме. Каб такую цеплавую «аперацыю» правесці, жаданне ўсіх жыльцоў спатрэбіцца. Дарэчы, у найноўшых дамах усталяваны не дарэвалюцыйныя кранікі, а сучасныя рэгулятары падачы цяпла. У гэтым выпадку аб'ём цяпла, які спажываецца, фіксуецца электронным абсталяваннем.

## Не разводзьце мора ў кватэры

**У. К.** — Добра, на цяпле вы 15 тысяч за месяц сэканомілі. Але ж мы далёка не ўсе пазіцыі ўдакладнілі. Наступным пунктам пазначана вада. Без яе, як той казаў, не пражывеш. А значыць, гэта будзе адным з найбольш дарагіх відаў паслуг. У вас, гляджу, вада-каналізацыя плюс гарачая вада цягнуць на 12,6 кубаметра. А ў мяне звычайна 8. Я разумею, што ў нас два чалавекі жывуць, у адрозненне ад вас з жонкай і дзецьмі, аднак...

**С. К.** — Бачу. Тут я плачу крыху больш. Прыкладна тысяч на дзесяць. Але стой! Я гляджу, тут у цябе два месяцы нейкія «нестандартныя». Бачыш? У «жыроўцы» два разы радок «вада-каналізацыя» надрукаваны: 8 з дробяззю «кубоў» па тарыфе 1450, а ўнізе яшчэ 3 «кубы», але ўжо па 7900 рублёў за кожную адзінку перарасходу. Мабыць, вы ў гэты час у сваёй кватэры «чорнае мора» адкрывалі... А гэта дадатковыя 26 тысяч рублёў. Вось маю дзясятку вы і пераплюнулі. Удакладні, адкуль такія лічбы: што, смага замучыла?

**У. К.** — Ага, піць хацелася. Сядзеў у ванне і адразу з «доджыка» заліваў. Пару разоў з суседзямі падзяліўся... Не, калі сур'ёзна, то я і сам не ведаю, як мы змаглі «водны» нарматыў перакрочыць. Паглядзіце, з месяца ў месяц ледзь 8 набягае, а тут такое...

**С. К.** — Паслухай сюды. Недзе гады тры таму ў мяне была падобная сітуацыя. Я тады спецыяльна рэвізію сваіх бытавых прыбораў зрабіў. «Вадажора» мы ў прыбіральні знайшлі. Стаіць новенькі беленькі ўнітаз, нікога не чапае і пацыху так «працуе ручайком». Гэта на першы погляд і не заўважыш. Але ж у «жыроўцы» буйныя лічбы з'яўляюцца, калі гэты злодзей кругласутачна цячэ. Прачысціў яму клапан за хвіліну — і ўсё. Потым і лічбы «ўсталі на сваё месца».

**У. К.** — Але ў мяне з унітазам усё ў парадку: ён жа новы.

**С. К.** — А пральная машына ў цябе з якім класам водаспажывання?

**У. К.** — Не ведаю. Ніколі не звяртаў на гэта ўвагу. А што, ёсць адрозненні? Я думаю, што гэта асабліва не ўплывае.

**С. К.** — Ёсць, дружа мой, ёсць адрозненні. Гэты бытавы прыбор не толькі па энергаспажыванні клас мае, але і па вадзе. А яшчэ ўважліва пачытай інструкцыю: там пры невялікай загрузцы эканомны рэжым па вадзе прадугледжаны. Лішні раз на пімпачку націснуў — вядро вады сэканоміў. Дарэчы, я гляджу, у цябе самая вялікая лічба расходаў менавіта на электраэнергію і прыпадае.

## Нам усё «да лямпачкі»

**У. К.** — Ёсць такое. Гэта ўсё наш бойлер, які ваду награвае. Мы яго замест газавай калонкі паставілі, калі пераязджалі ў новую кватэру, бо гарачая вада ў нашым доме ўвогуле не прадугледжана. Вядома, даводзіцца плаціць за электрычнасць вялікія грошы, бо звычайна «набягае» каля 300-350 кВт/г, а гэта прыкладна 200 тысяч рублёў штомесяц атрымліваецца. Але мы, у адрозненне ад вас, за гарачую ваду не плацім.

**С. К.** — Давай падлічым мае выдаткі. Наша вялікая сям'я на падагрэў вады рэгулярна аддае недзе 30-35 тысяч. А па электрычнасці я ў сацыяльны ліміт 150 кВт/г заўсёды ўкладваюся. Прыплюсуем да 35 яшчэ 90 тысяч — і атрымліваем 125 тысяч.

**У. К.** — Што, вы мяне зноў абагналі? Я ажно на 75 тысяч па эканоміі адстаў. Не веру, што вы з такой вялікай сям'ёй можаце спажываць так мала электрычнасці. Відаць, мухлюеце ці вашы дзеткі ўрокі пры лучыне робяць?

**С. К.** — Ты яшчэ скажы, што яны гусіным пяром на пергаменце пішуць... Ёсць у іх і смартфоны, і камп'ютар. Справа тут у іншым. У нашай кватэры даволі светла: увогуле 11 лямпачак атрымліваецца, але ўсе яны выключна энергазберагальныя. Напрыклад, на кухні можна ўключыць тры «светлавыя кропкі» па 9 Вт, якія замяняюць тры звычайныя лямпачкі па 45 Вт. А гэта 80% эканоміі. Ты энергазберагальным лямпачкам якога вытворцы аддаеш перавагу? Мне ў свой час больш польскія падабаліся. А цяпер і айчынныя брэсцкія пачынаю тэсціраваць.

**У. К.** — А я... Я іх увогуле не выкарыстоўваю. У мяне ўсе — звычайныя «лямпачкі Ільіча» са спіралькай. Энергазберагальных на мяне не хапіла. Такія, як вы, усе паскуплялі... А насамрэч я ім проста не вельмі давяраю. У люстры, што вісіць у зале, у адным і тым жа цокалі, што ні рабілі, увесь час лямпачкі перагараюць. І калі мы пачнём купляць энергазберагальныя, у разоў 8 даражэйшыя, то будзем працаваць толькі на лямпачкі. Акрамя таго, мне здаецца, што ніякага асаблівага зберажэння ад такіх «навінак» няма.

**С. К.** — З люстрай я цябе ўвогуле не зразумеў. Калі яна з такім норавам, то месца ёй на сметніку. Я б, напрыклад, кожны тыдзень пад самую столь не лазіў. Табе з амаль двума метрамі росту такая аперацыя, мабыць, падабаецца. Цяпер сур'ёзна пра лямпачкі. «Звычайная спіралька» каштуе 5-6 тысяч і працуе каля года. А энергазберагальны ад 9 да 13 Вт — 25-35 тысяч рублёў з сярэднім тэрмінам працы каля 2 гадоў. Асобныя мае калегі мелі адмоўны вопыт карыстання гэтымі «светлячкамі», аднак у такім выпадку заўважу, што пры захоўванні скрыні і чэка лямпачка мае гадавую гарантыю. Мне з імі ўвогуле пашанцавала: большасць лямпачак адпрацавала 2,5-3 гады і яшчэ функцыянуюць. Наконт эканоміі: у майго суседа прыкладна такі самы набор бытавых прыбораў, толькі лямпачкі традыцыйныя, а ў яго «згарае» ўжо 170-180 кВт/г. За 150 ён плаціць па сацыяльным тарыфе, астатняе — на 30% больш. Памнож месячную эканомію на два гады — і атрымаецца, што энергазберагальныя лямпачкі акупляюцца.

**У. К.** — Як быццам вы толькі лямпачкамі і карыстаецеся. У вас што, няма ніякай тэхнікі? Ні пральнай машыны, ні халадзільніка, ні электрачайніка?

**С. К.** — А электрачайніка ў мяне і сапраўды няма. У нашай сям'і чаяванне прадугледжвае пэўны рытуал. А то што: шлёп на пімпачку — і вось табе гарбата! Да таго ж на газе танней атрымліваецца. Затое ёсць у мяне і пральная машына, і халадзільнік, нават ВК-тэлевізар і камп'ютар. Аднак гэтыя прыборы ў мяне не зусім стандартныя — толькі класа А па энергазберагальнасці. Маем таксама невялікі электраабагравальнік, але ён нам патрэбны толькі на працягу прыкладна тыдня ў міжсезонне.

**У. К.** — Гэта ўсё добра. Аднак, ведаеце, мне яшчэ цікава, колькі вы за інтэрнэт плаціце? Сёння ж без яго немагчыма жыць. А вашы дзеці, напэўна, не вылазяць з яго. А я сам шмат выкарыстоўваю — два мабільныя мадэмы для працы і дома.

**С. К.** — З інтэрнэтам бяда. Яго падключэнне я адцягваў да апошняга — пакуль старэйшая дачка ў дзясяты клас не пайшла. У гэтым выпадку вельмі сэканоміць не атрымалася: узяў адразу «безлімітку» за 132 тысячы ў месяц. Аднак дзеткі мае ў інтэрнэце сядзяць толькі па неабходнасці. Камп'ютар у нас адзін на ўсю сям'ю, таму не забалуеш. На мой погляд, добрая кніга ўсё ж такі лепш. Ганяю іх разам з жонкай у бібліятэку два разы на месяц. І гэта нават не абмяркоўваецца.

**У. К.** — А я за дамашні інтэрнэт плачу толькі 60 тысяч. Праўда, абмежаваны трафік. Але мне хапае: я фільмы і музыку не пампую. Іншая справа, што мадэм для працы каштуе яшчэ 80 тысяч. У любым выпадку, гэта неабходнасць. Так што ў мяне нават больш выходзіць. А ўвогуле я павінен прызнацца, што вы мяне пераканалі ў мэтазгоднасці эканоміі. Ёсць чаму павучыцца.

**С. К.** — Толькі пераканацца ў гэтым — мала. Тут дакладны рэцэпт беражлівасці трэба ствараць. Калі ведаеш, па якіх пазіцыях і якім чынам эканомія робіцца, гэта ўжо, лічы, палова справы.

**P.S.** *Аўдыязапіс размовы вы можаце знайсці на zviazda.by.*

**Сяргей КУРКАЧ,**
**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**



## Анатоль РУБІНАЎ,

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Шаноўныя чытачы газеты «Звязда»!

З вялікім задавальненнем віншую вас з надыходзячым Новым 2014 годам!

Новы год — самае цудоўнае і любімае свята. Няхай яно стане для вас светлым, добрым, радасным, поўным творчых планаў, здзейсненых надзей і жаданняў.

Шчыра жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!



## Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

— Мае самыя шчырыя сардэчныя віншаванні чытачам «Звязды» з Новым годам і Раством Хрыстовым!

Зычу, каб надыходзячы 2014 год быў плённым у вашых справах на карысць Айчыны, напоўненым духоўнай радасцю і душэўным спакоем, каб ён прынёс поспех, дабрабыт і сямейнае цяпло!

Няхай вам шчасціць!

# Год 2013-ы: чым ён нам запомніўся?

**Кожны дзень мы жывём будзённымі клопатамі, вырашаем надзённыя праблемы. І кола гэтых дзён няспынна коціцца наперад... Зараз мы сустракаем новы, 2014 год. Кожны з нас упэўнены: ён прынясе ўсё толькі самае добрае. А што засталося ў мінулым? Пра якія падзеі мы гаварылі больш, чым пра іншыя? Якія з іх зрабілі найбольшы ўплыў на жыццё краіны, на жыццё кожнага з нас і, магчыма, зробяць надалей? «Звязда» азірнулася на год 2013-ы, каб коратка прыгадаць, як і з чым мы яго пражылі...**

**ТАРЫФЫ.** З 1 лютага ў краіне ўведзена дыферэнцыяваная аплата за электраэнергію і газазабеспячэнне. Устаноўлена трохступеньчатая сістэма тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання электраэнергіі і газу. Напрыклад, для спажыўцоў, чые дамы абсталяваны газавымі плітамі, прадугледжвалася наступная сістэма аплаты электраэнергіі: пры месячным спажыванні да 150 кВт/г — па ўстаноўленых тарыфах, ад 150 да 300 кВт/г уключна — па тарыфах з павышальным каэфіцыентам 1,3, звыш 300 кВт — па тарыфах, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё выдаткаў.

**«ЛІЧБА».** З 1 сакавіка ў Беларусі пачала працу даведачна-інфармацыйная служба, якая была прызвана кансультаваць насельніцтва па пытаннях пераходу на лічбавае тэлевізійнае вяшчанне. Пераход з аналагавага на лічбавае ТБ-вяшчанне будзе завершаны ў краіне ў 2015 годзе.

**ШТОРМ.** На Беларусь абрынуўся снегавы шторм «Хаўер», які паралізаваў практычна ўсе аўтатрасы краіны, абмежаваў рух паветраных суднаў і прывёў да закрыцця аэрапорта ў Мінску. Самалёты перанакіроўвалі ў Гомель і Кіеў. На дарогах самая складаная сітуацыя склалася на выездзе са сталіцы ў бок расійскай мяжы. Таксама быў перакрыты рух на Магілёў, Гродна і ў іншых напрамках. У самым Мінску была паралізавана праца гарадскага транспарту. Цягнікі хадзілі з вялікім спазненнем. На барацьбу са стыхіяй накіравалі ўсе сілы МНС. Напярэдадні беларусаў папярэджвалі аб набліжэнні непагадзі. Толькі ў тое, што адбудзецца, практычна ніхто не паверыў...

**ВЯРТАННЕ.** З-за неспрыяльных умоў надвор'я на Зямлі на суткі была перанесена пасадка касманаўтаў, што планавалася на 15 сакавіка. У складзе экіпажу быў наш зямляк, ураджэнец Чэрвеня, трэці беларускі касманаўт Алег Навіцкі. Нягледзячы на такую затрымку звяршэння касмічнай адысеі, якая пачалася са старту касмічнага карабля 23 кастрычніка 2012 года, усё потым прайшло добра.

**ТЭАТР.** Пасля рэканструкцыі, якая доўжылася два з паловай гады, адкрыўся Купалаўскі тэатр *(на фота)*. Перад падрадчыкам работ стаяла няпростая задача — вярнуць будынку гістарычны воблік, а ўнутры ўстанавіць сучаснае абсталяванне. Для гэтага прыйшлося дэманціраваць усе апорныя канструкцыі, узмацніць падмурак і сцэны, прыбудаваць дадатковы корпус. Зараз у новым тэатры — сучасныя залы для рэпетыцый, зручныя грымёрныя. Большай стала і галоўная сцэна.



Фота БЕЛТА.

**ВЫСТУПЛЕННІ.** На міжнародным песенным конкурсе «Еўрабачанне-2013» Алена Ланская заняла 16 месца з 26. Аўдыторыя падзялілася: адны былі ў захапленні ад байцоўскіх якасцяў спявачкі, якая вырашыла ўдзельнічаць у нацыянальным адборы пасля скандальных падзей папярэдняга адборачнага этапу, другія крытыкавалі яе сцэнічны вобраз і кампазіцыю... Удзельнік дзіцячага «Еўрабачання», якое прайшло праз паўгода пасля дарослага, Ілья Волкаў таксама ў другі раз запар меў дачыненне да песеннага конкурсу. Але калі летась выступаў у падтанцоўцы, дык зараз дэбютаваў і як сольны выканаўца, і як аўтар кампазіцыі. Вынік — трэцяе месца.

**КАНФІСКАЦЫЯ.** Дэпутаты прынялі закон аб канфіскацыі аўтамабіляў за паўторную язду ў стане алкагольнага ап'янення. Таксама былі павялічаны штрафы за кіраванне транспартам нападпітку і тэрміны пазбаўлення волі за здзейсненыя п'янымі кіроўцамі дарожна-транспартныя здарэнні, якія пацягнулі за сабой чалавечыя ахвяры, да 10 гадоў турмы. Першы аўтамабіль быў канфіскаваны ў лістападзе ў Мінску. Яго кіроўца за апошнія некалькі тыдняў быў двойчы затрыманы за рулём у нецвярозым стане.

**ДАРОГІ.** З пачатку ліпеня некаторыя дарогі ў краіне сталі платнымі. Аплату праз адпаведную электронную сістэму планавалася ўкараніць на ўсіх рэспубліканскіх дарогах першай катэгорыі, чыя агульная працягласць складала 815 кіламетраў.

**ПЛОШЧА.** 2 ліпеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адкрыў у Мінску плошчу Дзяржаўнага сцяга. Плошча размешчана на праспекце Пераможцаў. Яна ўяўляе сабой круг радыусам 50 метраў, у цэнтры — 70-метровая стэла-флагшток. Палотнішча зроблена з воданепранікальнай тканіны, якая не выгарае на сонцы. Каб сцяг заўсёды развяваўся на ветры, стэлу ўстанавілі ў той частцы горада, дзе вецер дзьме пастаянна. Па перыметры плошчы размешчаны стэлы з картай Рэспублікі Беларусь, тэкстам гімна, гербамі абласцей і сталіцы.

**«КАЛІЙНЫ СКАНДАЛ».** Затрыманню кіраўніка «Уралкалія» папярэднічаў скандал паміж даўнімі партнёрамі. «Уралкалій» афіцыйна абвясціў аб адмове ад супрацоўніцтва з «Беларуськаліем» у рамках Беларускай калійнай кампаніі (БКК). Адной з прычын называлася адмена Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам выключнага права БКК на экспартныя пастаўкі беларускага калію і фактычную самастойную рэалізацыю прадукцыі. У адказ кіраўнік «Уралкалія» адмовіўся ад партнёрства з беларускай кампаніяй і пачаў праводзіць дэмпінгавую палітыку на рынку... На той момант следства ацэньвала шкоду, нанесеную беларускаму боку, у 100 мільёнаў долараў.

**СТРАВЫ.** У сталіцы ўпершыню прайшоў «Тыдзень беларускай кухні». У ім удзельнічалі 12 кавярняў і рэстаранаў, якія прапанавалі наведнікам адмысловае меню з такімі, напрыклад, стравамі, як плата сялянская, поліўка грыбная, бабка бульбяная, дранікі са смятанай. Цэны на іх былі аднолькавымі для ўсіх устаноў незалежна ад нацэначнай катэгорыі і кошту прадуктаў. Па задуме гарадскіх уладаў, праз такія мерапрыемствы, калі жыхары і госці сталіцы атрымаюць магчымасць ацаніць каларыт беларускіх страў, можна папулярызаваць нацыянальную кухню і развіваць культуру харчавання.

**ПРАВІЛЫ.** У краіне зарэгістравана 106 тысяч паляўнічых. А вуду ў руках хаця б зрэдку трымае, напэўна, ледзьве не кожны другі жыхар Беларусі. Таму змяненні ў правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства закрануць, безумоўна, многіх. Апроч іншых навоўведзеняў, варта адзначыць істотнае ўзмацненне адказнасці за незаконнае паляванне.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

---

■ Што ў кішэні?

# КАМУ І КОЛЬКІ

## Якімі былі нашы зарплаты ў адыходзячым годзе? Ужо можна падвесці некаторыя вынікі

Паводле звестак Белстата, намінальная налічаная **сярэднямесячная зарплата** ў нашай краіне ў студзені — лістападзе гэтага года склала 5 075 800 рублёў, у тым ліку ў лістападзе — 5.348.800 рублёў.

**Рэальная зарплата,** г. зн. зарплата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі, у студзені — лістападзе 2013 года ў параўнанні са студзенем — лістападам 2012 года павялічылася на 17%, але ў сёлетнім лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам знізілася на 3,9%.

Што тычыцца сярэдняй зарплаты **бюджэтнікаў,** то яна ў студзені — кастрычніку склала крыху больш за 3,7 мільёна. Дарэчы, гэта на 28% ніжэй, чым у цэлым па краіне. Прычым варта нагадаць, што Прэзідэнтам была пастаўлена задача паменшыць гэты разрыў максімум да 10%. Тэрмін быў заяўлены да 2015 года.

Аднымі з самых сціплых з'яўляюцца разліковыя лісткі **сацыяльных работнікаў:** іх сярэдні заробак у лістападзе складаў усяго 3 127 000 рублёў.

У той жа час, калі браць канкрэтныя галіны прамысловасці, то **на нафтаперапрацоўчых прадпрыемствах** краіны сярэдняя сума ў разліковых лістках была роўная 10 060 000 рублёў. Другое месца ў рэйтынгу самых высокааплатных спецыялістаў — у **работнікаў паветранага транспарту:** у лістападзе іх сярэдняя зарплата была роўная 10 619 000 рублёў. У лідарах жа традыцыйна аказаліся **спецыялісты ў сферы ІТ** — іх сярэдняя зарплата склала 13 290 000 рублёў.

***

За гэты год **тарыфная стаўка першага разраду** павялічвалася тройчы, апошняе яе павышэнне адбылося ў верасні, калі яна вырасла на 4% — да 260 тысяч рублёў. Нагадаем: гэты паказчык уплывае на ўзровень аплаты працы бюджэтнікаў. А гэта — 854,5 тыс. чалавек, ці 27,5% ад колькасці ўсіх работнікаў па рэспубліцы (менавіта такой была колькасць работнікаў бюджэтных арганізацый у кастрычніку гэтага года згодна з Белстатам).

***

У пачатку 2013 года **мінімальная зарплата** складала 1 395 000 рублёў (або 162 долары па курсе на 1 студзеня). Нагадаем, што мінімалка індэксуецца, калі кошты выраслі больш чым на 5% з моманту папярэдняй індэксацыі. Сёлета пераразлік адбыўся ў верасні. У выніку цяпер мінімальная зарплата ўжо большая, чым была ў пачатку года, і складае 1 466 230 рублёў (або 155 долараў па бягучым курсе).

Як правіла, мінімальную зарплату ўрад традыцыйна абнаўляе з пачаткам новага года. Таму ўжо з 1 студзеня беларусам нельга будзе плаціць менш чым 1 660 000 рублёў у месяц (па афіцыйным курсе сёння гэта 176 долараў). Дарэчы, больш ні на якія іншыя паказчыкі мінімальная зарплата не ўплывае. **Нагадаем, што зарплаты бюджэтнікаў залежаць ад тарыфнай стаўкі першага разраду (260 тыс. рублёў), а штрафы — ад базавай велічыні (якая з 1 кастрычніка складае 130 тыс. рублёў).**

**Святлана БУСЬКО.**

### Сярэдняя зарплата ў лістападзе 2013 года




### Як змянялася сярэдняя працоўная пенсія ў 2013 годзе




### Структура даходаў беларусаў

Па статыстыцы, у структуры даходаў беларусаў 64,4% прыпадае на зарплату; 20,8% — на сацыяльныя выплаты (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву); 10% займаюць даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, яшчэ 4,8% складаюць даходы ад уласнасці і з іншых крыніц.




### Пенсія за лістапад

У лістападзе 2013 года сярэдняя працоўная пенсія па інваліднасці склала 2 021 190 рублёў (у снежні 2012 года — 1 722 360 рублёў);

за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — 3 237 750 рублёў (у снежні 2012 года — 2 819 390 рублёў);

сацыяльная пенсія — 964 530 рублёў (у снежні 2012 года — 816 000 рублёў).

Максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў склала 3 490 000 рублёў, для непрацуючых пенсіянераў з ліку былых шахцёраў — ад 4 446 320 рублёў (пры стажы падземнай працы не менш за 10 гадоў у мужчын і 7,5 года ў жанчын) і да 5 402 900 рублёў (пры стажы працы не менш за 25 (20) гадоў). Максімальная пенсія па ўзросце для працуючых пенсіянераў склала 2 533 160 рублёў (пры індывідуальным каэфіцыенце заробку пенсіянера 1,3 і вышэй).

**P.S.** Розныя віды пенсій у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне атрымліваюць больш за 2,5 млн чалавек.

**Інфармацыя прадастаўлена Мінпрацы і сацабароны Беларусі.**

Паралімпійская чэмпіёнка Людміла ВАЎЧОК:

# «НАСТАЧКА — ГАЛОЎНЫ ЦУД У МАІМ ЖЫЦЦІ»

**Лёс Людмілы Ваўчок нагадвае паласу перашкод. Спачатку прыроджаная хвароба сэрца, затым — пералом пазваночніка і інвалідная каляска... Але ніводнае з гэтых выпрабаванняў не здолела стрымаць валявую дзяўчыну, якая насуперак лёсу стала не толькі трохразовай паралімпійскай чэмпіёнкай, але і... мамай.**




## Пра беднага фізрука, злашчасную антэну і надзейныя рукі

У дзяцінстве ў Люды выявілі праблемы з сэрцам. Доктар параіў яе маці не спяшацца з аперацыяй, але максімальна абмежаваць фізічныя нагрузкі. Але ж, вядома, дзіця ёсць дзіця: энергія біла цераз край...

— Я заўсёды была няўрымслівай, — усміхаецца Людміла і віртуозна пракручваецца на задніх колах сваёй каляскі, быццам ваўчок. — Таму, хоць і забаранялі, адціскалася ад падлогі і падцягвалася больш за ўсіх. Бедны настаўнік фізкультуры пасля кожнага ўрока мераў мне пульс... Але больш за ўсё я любіла бегаць на доўгія дыстанцыі, таму цішком запісалася ў секцыю па лёгкай атлетыцы. Дзякуй маме — падтрымала, бачыла, што без руху я гіну.

...І што б вы думалі? Здарыўся сапраўдны цуд — Люда перарасла хваробу. І ўпэўненымі крокамі пачала заваёўваць свае першыя спартыўныя ўзнагароды. Пасля таго, як 14 гадоў таму стала бронзавым прызёрам Кубка Еўропы ў бегу на 5 кіламетраў, пачала рыхтавацца да выступлення на Алімпіядзе ў Афінах. Але мара аб алімпійскіх Афінах абарвалася ў адно імгненне...



Старэйшы брат — галоўны мужчына ў жыцці Людмілы.

— 11 верасня адбылася страшная трагедыя: у Нью-Ёрку рухнулі вежы гандлёвага цэнтра, — узгадвае Людміла. — А на наступны дзень я палезла на дах інтэрната, каб паправіць тэлевізійную антэну. Спатыкнулася і паляцела ўніз....

Пазней ад урачоў 20-гадовая дзяўчына пачула страшны прысуд: «Больш хадзіць не зможаш». Для спартсменкі, якая ўваходзіла ў склад алімпійскай зборнай, гэта была катастрофа...

— Калі б не падтрымка мамы з братам, якія па чарзе дзяжурылі ля майго ложка ў бальніцы, не ведаю, ці справілася б я... — кажа Люда і паказвае фотаздымкі сваёй сям'і. — Раней у нас з братам былі адносіны на ўзроўні «прывітанне — пакуль». А пасля трагедыі ён не адыходзіў ад мяне ні на крок: мыў, пераадзяваў, пераварочваў, каб не ўтварыліся пролежні... «Ведаеш, я толькі цяпер зразумеў, як я цябе люблю...», — сказаў ён мне тады. Мы з братам і сёння не разлі вада. Ён — галоўны мужчына ў маім жыцці. Ва ўсім мяне падтрымлівае, заўсёды гатовы падставіць плячо. Калі трэба было выбраць для дачкі хроснага тату, я нават не задумвалася, бо ведаю: калі што, Настачка будзе ў надзейных руках.

— Ведаеш, калі шчыра, мне нельга крыўдзіцца на свой лёс, — чую ад Люды зусім нечаканае прызнанне. — Бо сама яго пастаянна выпрабоўвала. Я ж без тармазоў расла. Глядзі *(паказвае фота)*, залазіла вось на гэта дрэва і скакала з вышыні трохпавярховага дома ў плыткую рэчку... А колькі разоў пад лёд на каньках правальвалася... Магла ж зламаць сабе шыю яшчэ ў дзяцінстве... Мне заўсёды бракавала адрэналіну!.. Напэўна, у нейкі момант майму анёлу проста надакучыла выратоўваць... І ён вырашыў праверыць мяне на трываласць.

## Пра тэлефонны званок, «цяжарны» заплыў і камячок шчасця

З часам Люда навучылася жыць па-новаму. Калі выпісалася з бальніцы, пачала ездзіць у рэабілітацыйны комплекс для інвалідаў-калясачнікаў у Калодзішчы, каб займацца з дзеткамі. Вырашыла быць там, дзе магла камусьці дапамагчы. Дапамагала і паралельна трэніравалася.

— Я практычна спала ў спартзале, — усміхаецца Людміла. — Хацела, каб мяне заўважылі, узялі ў спорт. Спрабавала сябе і ў штурханні ядра, і ў паўэрліфтынгу, і ў армрэслінгу. Я нават нарматывы майстра спорту выканала па штанзе ў вагавой катэгорыі 44 кілаграмы, а ў парных танцах на інвалідных калясках стала чэмпіёнкай Беларусі. Але ніхто не хацеў

**«Ведаеш, я толькі цяпер зразумеў, як я цябе люблю...», — сказаў ён мне тады. Мы з братам і сёння не разлі вада.**

са мной важдацца, бо я на калясцы... А аднойчы мне патэлефанавала трэнер Тамара Мікалаеўна Шыманская... Гэты званок перавярнуў усё маё жыццё. Яна пачала ўгаворваць мяне паспрабаваць сябе ў лыжных гонках. Я спачатку супраціўлялася, бо са школы недалюблівала лыжы.

Але зноў адбыўся цуд: ужо праз пяць гадоў пасля траўмы Людміла Ваўчок заваявала залаты і тры сярэбраныя медалі Паралімпійскіх гульняў па лыжных гонках на санках. Тое, што не любіла, прынесла не толькі славу, але і даход. Пасля Алімпіяды спартсменцы сталі плаціць рэгулярную зарплату і выдзелілі ўтульную трохпакаёвую кватэру ў алімпійскім гарадку ў сталічным раёне Вяснянка. Апошняя не так даўно напоўнілася дзіцячым смехам...

— У Славенію — заваёўваць пуцёўку на Паралімпійскія гульні па веславанні ў Лондане — я паехала на чацвёртым месяцы цяжарнасці, — распавядае Людміла. —

**«Трэба было праплыць усяго тысячу метраў. Падумала: я ж не хворая, а проста цяжарная. Еду!..»**

Трэба было праплыць усяго тысячу метраў. Падумала: я ж не хворая, а проста цяжарная. Еду!..

Праз месяц пасля родаў спартсменка ўжо рыхтуецца да Паралімпійскіх гульняў у Лондане. Як вынік — чарговы медаль. Яго маладая мама прысвяціла дачцэ. Але падчас шчырай размовы прызналася, што менавіта нараджэнне дзіцяці — яе самая галоўная перамога.

— Адкуль у вас столькі энергіі? — спрабую высветліць у Людмілы, якая паспявае не толькі даваць інтэрв'ю, але і ўцякаць ад Насты, якая даганяе маці на дзіцячым веліку.

— Ды вось ад гэтага камячка шчасця... — Люда пяшчотна прытуляе да сябе дачушку, імя якой перакладаецца з грэчаскай, як «тая, якая вяртае да жыцця». — Настачка — самы галоўны цуд у маім жыцці. Разам з дачушкай у маё жыццё прыйшоў новы глыбокі сэнс. Цяпер ведаю, што ў адказе не толькі за сябе, але і за вось гэты любімы камячок. Хочацца зрабіць для яе як мага больш.

## Пра моцнага мужчыну, яблыкі ў цесце і скачок з парашутам

Пакуль Люда на трэніроўцы, за Настай прыглядае бабуля.

— Часам і іх бяру з сабой, — кажа спартсменка. — Сама іду ў трэнажорную залу, а мама з Настачкай плаваюць у басейне. Пакуль я тут, мне хочацца, каб дачка была ўвесь час побач са мной. Вось цяпер пачалі актыўна рыхтавацца да Алімпіяды ў Сочы. Нядаўна вярнулася з Эстоніі. Калі я з'язджаю на зборы, Наста застаецца з бабуляй. Вельмі сумую без дачкі. Толькі скайп нас выратоўвае.

З бацькам малой Люда ў добрых адносінах, але замуж за яго не спяшаецца. Проста, прызналася, хочацца, каб побач быў моцны мужчына, здольны абараніць, паклапаціцца...

— Нас траіх мама адна выгадавала, і нічога, усе ў людзі выйшлі! — усміхаецца энергічная Людміла. — Так што справімся. Ёсць галава, рукі і вера ў свае сілы. А гэта ж галоўнае! Нам няма калі раскісаць!

У пацвярджэнне сваіх слоў Люда пачынае збірацца на трэніроўку. Якраз у гэты час, каб прыгледзець за ўнучкай, прыехала Галіна Пятроўна са Смілавіч.

— Дзяўчаткі, вы ж галодныя, пэўна? — пачынае завіхацца ля пліты мама спартсменкі, якая, як высветлілася, усё жыццё працуе фельчарам на «хуткай». — А давайце я вам юшку пагрэю. Ці мо тваражку з павідлам хочаце? Павідла з чорных парэчак я сама варыла, за горадам агародзік невялічкі маю. А вось яблычкі, запечаныя ў цесце, частуйцеся! Люда іх гатуе так, што пальчыкі абліжаш.

— Ведаеш, я люблю гатаваць што-небудзь новае, — даносіцца голас Людмілы з суседняга пакоя. — Але па магчымасці стараюся не замыкацца ў чатырох сценах. Проста жыць хочацца паўнавартасна. Нядаўна ў Турцыю адна лятала. Адпачыла па поўнай праграме. Спускалася па горнай рацэ на плытах разам з немцамі *(паказвае фота, з якога праз пырскі шчасцем свеціцца твар Люды)*. Было так весела! Мы там нават перакуліліся адзін раз, упалі ў ледзяную ваду. Таксама ездзіла на матацыкле з хуткасцю 250 кіламетраў за гадзіну. У Егіпце таксама не абышлося без прыгод: каталася на квадрацыклах. Яшчэ я вельмі люблю турзлёты з начоўкай у палатках і гутаркамі ля агню. Імкнуся часцей сустракацца з сябрамі. Вось сёння ўвечары нас з Насцяй запрасілі на хакей.

**Ад урачоў 20-гадовая дзяўчына пачула страшны прысуд: «Больш хадзіць не зможаш». Для спартсменкі, якая ўваходзіла ў склад алімпійскай зборнай, гэта была катастрофа...**

У вольны час Люда гуляе ў тэніс, плавае ў басейне і нават... скокнула з парашутам.

— Думаеш, пасля траўмы я стала баяцца вышыні? — яна ўлоўлівае здзіўленне ў маіх вачах. — Зусім не! Наадварот, зразумела, што наогул нічога не баюся і магу справіцца з любой сітуацыяй. Калі абставіны складаюцца супраць мяне — гэта толькі дадае адрэналіну і ўпартасці. Я ў блін расплюскаюся, але зраблю тое, што намеціла. Гэтаму мяне навучылі жыццё і спорт. І яшчэ я ніколі не бываю ў роспачы. Лічу, што нават з самай цяжкай сітуацыі заўсёды ёсць выйсце.

— А дэпрэсія?..

— Ды яна часцей ад гультайства! А лепш спытай у маёй мамы, што такое дэпрэсія! Яна табе і пра дэпрэсію, і пра мігрэнь раскажа — пра ўсе гэтыя прыгожыя словы. Яна ўсіх вылечыць! На калгаснае поле пустазелле палоць паставіць — тады ўсе нягоды ў момант пройдуць (*смяюцца*)!

Калі Галіна Пятроўна паказала мне прыгожыя карціны, якія Люда вышывае сваімі рукамі, я, шчыра прызнацца, вельмі здзівілася. Ну ніяк не сумяшчалася ў маёй свядомасці непаседлівая спартсменка, якая нават падчас інтэрв'ю умудралася пераключацца на нейкія іншыя справы, і гэтая карпатлівая праца!..

— Перад спаборніцтвамі трэба адпачываць, канцэнтраваць энергію, а не растрачваць. Таму на зборах у мяне заўсёды з сабой вышыўка. Так я навучылася сябе стрымліваць.

*Разам спускаемся ўніз на ліфце. Люда энергічна вітаецца з дворнікам Міхаілам, дачкой трэнера, які жыве па суседстве, цікавіцца, як у іх жыццё... І я лаўлю сябе на думцы, што ўжо нават і не заўважаю яе інвалідная каляскі. Згадваю пра яе толькі тады, калі Люда, якая паспела перасесці за руль свайго «Фольксвагена Пасата» з ручным кіраваннем, папрасіла закінуць каляску ў багажнік.*

*— А «зорнай» хваробы не баіцеся? — пытаюся ў спартсменкі на развітанне.*

*— Што ты! Ад яе ёсць эфектыўныя лекі: пастаянныя фізічныя трэніроўкі. І потым, я па-філасофску стаўлюся да рэчаіснасці. Так, цяпер я чэмпіёнка, купаюся ў славе, мяне ў прамым сэнсе гатовы на руках насіць... А заўтра ўсё можа скончыцца. Жыццё ж непрадказальнае. Хто б мне сказаў у школе, што я скончу магістратуру? (смяецца) Але ж скончыла летась. Атрымала спецыяльнасць «турызм і гасціннасць». Такі вось зачын на будучыню. Бо, самі разумееце, спорт не вечны, гады бяруць сваё... Таму, калі што, змагу працаваць у турызме, падымаць пытанні пра безбар'ернае асяроддзе. Без працы не застануся, і не марце!*

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН і з архіва Людмілы ВАЎЧОК.**



**Адна выдуманая гісторыя распавядае пра чалавека, які доўга прасіў Бога аб аўтамабілі, а той просьбу не выконваў. Мужчына ўжо пачаў наракаць, што нябёсы забыліся пра яго. Аж раптам аднекуль пачуўся голас: «Ты хаця б латарэйны білет здагадаўся набыць...» Хто-хто, а распаўсюджвальнікі латарэек могуць расказаць пра ўсе магчымыя спосабы, якімі карыстаюцца нашы суайчыннікі, каб выцягнуць выйгрышны білет...**



onliner.by

# ЯК «КУПІЦЬ» УДАЧУ?

...Людміла Уладзіміраўна і Ніна Іванаўна «прадаюць удачу» ўжо досыць даўно. Першая распаўсюджвае «Ваша лато» на працягу дзесяці гадоў, а другая — амаль трынаццаць. Працуюць жанчыны ў пераходах на дзвюх розных станцыях мінскага метро. Месцы, трэба сказаць, шматлюдныя. Кожны дзень міма прабягаюць сотні чалавек, якія марацьпра шчаслівы выпадак.

— Большасць, чые думкі скіраваны выключна на выйгрыш, стаяць і выбіраюць вельмі доўга. Адны сочаць, каб у нумарах некалькіх білетаў траплялася нейкая пэўная лічба, напрыклад, 6. У другіх ёсць свой шчаслівы лік: дзень нараджэння, дата вяселля і г.д. і яны робяць стаўку выключна на яго. Цікава, што існуе і «ўніверсальны код». Вельмі многія хочуць набыць білеты з лічбай 90 і ні ў якім разе не купляюць тыя, дзе ёсць адзінка,— прыгадвае Ніна Іванаўна ўсе «лічбавыя» прымхі, якіх прытрымліваюцца аматары латарэі.

А прыкмет, аказваецца, намала. Людміла Уладзіміраўна таксама ўзгадвае некалькі:

— Пакупнікі могуць папрасіць адразу пачак білетаў і ўзяць той, што ляжыць 13-м ці 7-м зверху. Набыць апошнія білеты, што засталіся ў распаўсюджвальніка, для некаторых таксама прыкмета ўдачы,— распавядае жанчына.

Менш рацыянальныя асобы на лічбах не засяроджваюцца, а таму разлічваюць, відаць, на «шостае пачуццё», папросту прыглядаючыся да стоса з білетамі. Пастаяць-пастаяць, падумаюць сабе нешта, і толькі пасля купляюць. Але часам «гіпнатызавання» чамусьці недастаткова. Тады ў ход ідуць нашмат больш хітрыя метады...

...Адзін са спосабаў прывабіць удачу, у які вераць аматары латарэі,— папрасіць, каб білет выбрала дзіця. Гэта добра, калі свае ёсць. А калі няма, што рабіць? Правільна — «арандаваць». Бывае, чалавек некалькі хвілін стаіць і чакае, пакуль міма пройдуць мама ці тата з дзіцем. Такіх спыняюць і настойліва просяць дапамагчы ў важнай справе. Часам бацькі чамусьці пужаюцца і малых не пускаюць.

Некаторым набыць выйгрышны білет перашкаджаюць... уласныя рукі. Бо калі заблытаешся, у якім парадку імі карыстацца, усю справу змарнуеш. Так, грошы распаўсюджвальніку «трэба» даваць толькі левай рукой, а білет браць — толькі правай. Гэтае правіла, дарэчы, часам выконваецца і наадварот. Тады білет бярэцца левай рукой, бо яна «ад сэрца».

— Часта просяць і мяне выцягнуць, каб быў білет ад «майго сэрца»,— са смехам прыгадвае Ніна Іванаўна.

Калі і гэта не дапамагае выцягнуць выйгрышны білет, застаецца толькі звярнуцца да махінацый з грашыма. У пераносным сэнсе, зразумела. Правіла ўдачлівага гульца ў латарэю гаворыць, што ні ў якім разе нельга набываць новыя білеты на выйграныя грошы. Іх трэба атрымаць і акуратна пакласці ў кашалёк, а з яго выцягнуць суму «нелатарэйнага» паходжання і аплаціць чарговую спробу скарыць удачу.

Хто ж выйграе часцей: асобы з рацыянальным падыходам ці тыя, хто спадзяецца на шчаслівы выпадак? Ніна Іванаўна, і Людміла Уладзіміраўна лічаць, што такой заканамернасці не існуе. І рацыянальным, і рызыкоўным перш за ўсё дапамагае шанцаванне.

— Калі толькі пачынала працаваць, ахвотных набыць латарэю было столькі, што часам нават не хапала білетаў,— распавядае Ніна Іванаўна.— Памятаю аднаго хлопца. Ён перад кожным тыражом набываў па 200–300 білетаў. Не жартую, самая малая яго пакупка — гэта 120 штук. І, відаць, гульня ішла ўдала, бо прыходзіў ён зноў і зноў. Цяпер, праўда, не бачу яго. Мабыць, у іншы раён пераехаў.

Сёння такіх апантаных пакупнікоў амаль не сустрэнеш. Але пастаянныя кліенты ўсё роўна ёсць. Сярод іх вельмі шмат пенсіянераў. Але для іх гэта хутчэй забава, якая не дазваляе сумаваць. Такія гульцы не правяраюць білеты ў інтэрнэце пасля розыгрышу, яны з нецярпеннем чакаюць, калі розыгрыш пакажуць па тэлебачанні.

Ніна Іванаўна прыгадала яшчэ адну цікавую мэту пакупкі латарэй. Бацькі бяруць «лато» для сваіх дзяцей, каб тыя... лепш запаміналі лічбы. Аказваецца, шукаць аб'яўлены па тэлевізары лік на сваім білеце ў надзеі нешта выйграць — гэта неблагая матывацыя для вучобы. Можа быць і яшчэ больш цікава.

— Адна пакупніца доўгі час набывала білеты для свайго сына-падлетка,— кажа распаўсюджвальніца.— Ён быў захоплены матэматыкай і ўсё стараўся дзякуючы сваім здольнасцям пралічыць, як жа можна выйграць у латарэю. Не ведаю, што ў яго атрымалася, але цяпер хлопец вучыцца ў прэстыжным універсітэце.

Ніна Іванаўна, як сама кажа, заўжды пакупнікоў «забаўляе». Выстаўляе перад сваім працоўным месцам шмат рэкламы — людзі ідуць за білетамі больш актыўна. Вельмі прыцягваюць увагу абяцанні вялікіх выйгрышаў: кватэр, машын ці каштоўных прыгажэнняў. Трэба сказаць, на ўсё гэта знаходзяцца шчаслівыя ўладальнікі, а чужая ўдача вельмі многіх уражвае.

— Неяк у мяне купіла білет жанчына, якая пасля выйграла па ім 300 мільёнаў рублёў,— кажа Ніна Іванаўна.— І пра гэта даведалася ад яе сяброўкі, якая не паленавалася спецыяльна прыехаць на «Пушкінскую» — у надзеі, што і яна тут набудзе выйгрышны білет. І ўвогуле, гэта амаль закон: калі хтосьці адзін выйграў нешта каштоўнае, ведай, што купляць білеты прыедуць ледзь не ўсе яго калегі і знаёмыя.

Часта прадавала білеты «улюбёнцам лёсу» і Людміла Уладзіміраўна. Тыя, у каго здараўся вялікі выйгрыш, бывала, вярталіся з каробкай цукерак ці шакаладкай. Маўляў, падзяліцца радасцю...

**Правіла ўдачлівага гульца ў латарэю гаворыць, што ні ў якім разе нельга набываць новыя білеты на выйграныя грошы. Іх трэба атрымаць і акуратна пакласці ў кашалёк.**

І Людміла Уладзіміраўна, і Ніна Іванаўна ў латарэю таксама гуляюць, але прызнаюцца, што выйгрышы ў іх пакуль не надта вялікія. А людзей, што кожны дзень падыходзяць да іх з надзеяй выйграць, распаўсюджвальніцы характарызуюць так: ёсць сярод іх уселякія, нават і вельмі азартныя. Але ўдача ўсё ж рэч непрадказальная і не паддаецца ніякім хітрыкам. Можна набыць адзін білет і выйграць некалькі мільёнаў, а можна «адшкадаваць» грошай на сто штук, і ў выніку застацца ні з чым. Абедзве жанчыны прызнаюцца, што за шмат гадоў працы так і не зразумелі, як Спадарыня Удача вырашае, каму ўсміхацца...

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# ВЫЙГРЫШ, ЯКІ ЗМЯНІЎ ЖЫЦЦЁ

**Кажуць, цуды здараюцца ў першую чаргу з тымі, хто гэтага сапраўды хоча. Ці, магчыма, з тымі, хто ўжо стаміўся ад жыццёвых праблем і гатовы вось-вось здацца. Прынамсі, менавіта такая гісторыя здарылася з нашай гераіняй — Нінай Міхайлаўнай КАМАНОЎСКАЙ, работніцай завода аўтамабільных агрэгатаў з Асіповічаў. Яе даўнюю праблему вырашыў... білет. Латарэйны.**

— Увогуле, я не такі ўжо і заўзяты гулец,— прыгадвае Ніна Міхайлаўна.— Раней часта гуляла ў латарэі, а вось апошнім часам зусім мала. Набывала білеты ў Асіповічах з зарплаты, можа, некалькі разоў на месяц. Выйгравала грошы — нават да 100 тысяч даходзіла, але сур'ёзных сум не выпадала. Гэта адбылося ў дзень нараджэння майго ўнука, які з дачкой жыў у Мінску. Я набыла «двойку» (ніколі не набываю адзін білет: заўжды бяру два ці тры), паклала ў кашалёк і забылася пра гэта. Памятаю толькі, што вочы «бралі» адзін, а рукі выцягнулі іншы.

Ніна Міхайлаўна паспела адсвяткаваць дзень нараджэння ўнука, з'ездзіць у адпачынак ва Украіну і вярнуцца. А забыты латарэйны білет чакаў свайго часу ў кашальку гаспадыні...

— Я нават не ведала, што нас шукаюць,— кажа Ніна Міхайлаўна.— Давалі аб'яву па радыё, у газетах пісалі. А мяне проста не было на радзіме. Білет я праверыла ледзь не праз тры месяцы пасля розыгрышу — 9 ліпеня. Зайшла ў банк па нейкіх пытаннях, чаргі не было, і я ўспомніла пра яго. У касе працавала мая знаёмая, я папрасіла яе праверыць. І тут яна кажа: «Міхайлаўна, па адным білеце нічога, па другім ёсць грошы». Я смяюся: «Ну і колькі там тых грошай?». І тут яна пачынае глядзець то на манітор камп'ютара, то на мяне, потым зноў на манітор. Моўчкі бярэ паперу і ручку, нешта піша. Як убачыла я лічбу на той паперчыне, мяне быццам бы токам з галавы да пят працяло: 427 мільёнаў 800 тысяч рублёў!..

Аказалася, што ў той дзень на адзін з двух білетаў выпаў джэк-пот. Прыз — аднапакаёвая кватэра ў Бараўлянах, аўтамабіль Skoda Fabia і 5 мільёнаў рублёў. Пасля перараздзелу кошту кватэры гаспадары атрымалі яшчэ 5,5 мільёна... Машыну ў сям'і Ніны Міхайлаўны ніхто не водзіць, таму пераможца палічыла за лепшае ўзяць грашовую кампенсацыю.

Грошы яна паклала ў банк. Кажа, што іх забярэ ўнук, якому хутка споўніцца 18 гадоў. Кватэра... Доўгія гады менавіта кватэрнае пытанне было галоўнай праблемай дачкі Ніны Міхайлаўны — жыллё ў сталіцы прыходзілася здымаць. Разам з мужам і сынам яна раз'язджала па чужых кватэрах. Таму такая нечаканая ўдача прыйшлася не проста да месца — яна падарыла шчасце ўсёй сям'і. І, напэўна, не меншае шчасце самой Ніне Міхайлаўне: зрабіць такі падарунак роднай дачцэ можа далёка не кожны.

— Цяпер я набываю білеты кожны тыдзень — калі адчуеш аднойчы смак перамогі, хочацца яшчэ. Дачка ўжо год шчаслівая жыве са сваёй сям'ёй у новай кватэры ў экалагічным квартале «Зялёны Бор». Пасля гэтага жыццё сапраўды змянілася. Што казаць, калі ўсе праблемы вырашыліся быццам бы самі сабой, нейкім цудоўным чынам. Людзі часта не вераць у цуд, не вераць у магчымасць выйгрышу ў латарэю. Кажуць, што ўсе грошы дастаюцца «сваім». Так было і з маімі калегамі на працы. Усе сумняваюцца, што выйграць можа кожны, што шанцуе самым розным людзям. Але цяпер у іх ёсць прыклад такой перамогі.



onliner.by

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**



**Валерыя КЛІЦУНОВА, старшыня праўлення грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы»:**

*— 2013 год па ініцыятыве Мінспорту быў аб'яўлены Годам зялёнага турызму, таму ўсе мае думкі былі пра яго. Хацелася зрабіць нешта асаблівае. З таго, што атрымалася,— дзень адкрытых дзвярэй на аграэкасядзібах у маі, наша нацыянальная канферэнцыя ў снежні, кніга па агра-экатурызме, якая вось-вось выйдзе, і новая інфармацыйная кампанія ў падтрымку нашага руху «Простыя рэчы». Сёлета споўнілася і мая мара: пабывала ў Кеніі. Жыла ў племені масаі, у сям'і, дзе шмат не толькі дзяцей, але і жонак. Прырода, а таксама прыгажосць і мудрасць гэтых людзей пакінулі глыбокі след. Жадаю, каб для кожнага чытача «Звязды» новы год стаў таксама чымсьці адметным і запамінальным.*



**Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь:**

*— Адыходзячы 2013 год выдаўся даволі складаным і неадназначным. Капрызлівае і вельмі пераменлівае надвор'е не раз вымушала перакройваць планы. А вось на беларускіх дарогах ён стаў значна спакайнейшым за папярэдні: колькасць загінулых скарацілася. Будзем імкнуцца да таго, каб 2014 год выдаўся яшчэ лепшым. І вельмі хочацца ўбачыць налета на дарогах больш добразычлівасці і ўзаемаразумення паміж пешаходамі і кіроўцамі — чаго ім і жадаю!*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### СТУДЗЕНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

### ЛЮТЫ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | | |

### САКАВІК

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

### КРАСАВІК

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

### МАЙ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

### ЧЭРВЕНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

### ЛІПЕНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

### ЖНІВЕНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

### ВЕРАСЕНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

### КАСТРЫЧНІК

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

### ЛІСТАПАД

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

### СНЕЖАНЬ

| П | А | С | Ч | П | С | Н |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

# Праваслаўны каляндар

***Пасхалія................................ (паводле новага стылю)***
***Пачатак Масленіцы.................................. 24 лютага***
***Пачатак вялікага посту............................ 3 сакавіка***
***Вербная нядзеля ....................................... 13 красавіка***
***Пасха (Вялікдзень).................................. 20 красавіка***
***Узнясенне ............................................................ 29 мая***
***Пяцідзясятніца (Троіца)............................. 8 чэрвеня***
***Пачатак Пятровага посту....................... 16 чэрвеня***

## Двунадзясятыя непераходныя святы

*7 студзеня, аўторак .................... Раство Хрыстова*
*19 студзеня, нядзеля .................. Хрышчэнне Гасподняе*
*15 лютага, субота ....................... Стрэчанне Гасподняе*
*7 красавіка, панядзелак............. Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы*
*19 жніўня, аўторак ...................... Праабражэнне Гасподняе*
*28 жніўня, чацвер........................ Успенне Прасвятой Багародзіцы*
*21 верасня, нядзеля ................... Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы*
*27 верасня, субота....................... Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга*
*4 снежня, чацвер ........................ Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы*

## Вялікія святы

*14 студзеня, аўторак .................. Абрэзанне Гасподняе і памяць свц. Васілія Вялікага*
*7 ліпеня, панядзелак .................. Нараджэнне Іаана Прадцечы*
*12 ліпеня, субота......................... Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла*
*11 верасня, чацвер ..................... Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы*
*14 кастрычніка, аўторак.............Пакроў Прасвятой Багародзіцы*

## Галоўныя памятныя даты зямлі Беларускай

*11 мая, нядзеля.......................... Свяціцеля Кірыла Тураўскага*
*20 мая, аўторак.......................... Жыровіцкай іконы Божае Маці*
*5 чэрвеня, чацвер ...................... Прападобнай Еўфрасінні Полацкай*
*29 чэрвеня, нядзеля .................. Сабор Беларускіх святых*
*2 жніўня і 18 верасня .................. Прападобнамучаніка Афанасія, ігумена Брэсцкага*
*26 жніўня, аўторак ..................... Мінскай іконы Божае Маці*

## Шматдзённыя пасты

Вялікі пост ................................. *з 3 сакавіка да 19 красавіка*
*Пятроў пост ................................ з 16 чэрвеня да 11 ліпеня*
*Успенскі пост.............................. з 14 жніўня да 27 жніўня*
*Пост перад Раством Хрыстовым з 28 лістапада да 6 студзеня 2015 года*

## Аднадзённыя пасты

*Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёедных тыдняў і Каляднага перыяду*
*Навячэр'е Богаяўлення ........................... 18 студзеня*
*Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы..... 11 верасня*
*Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга............. 27 верасня*

## Усёедныя тыдні (па серадах і пятніцах посту няма)

*Калядны перыяд .......................................... з 7 да 17 студзеня*
*Мытара і фарысея......................................... з 10 да 15 лютага*
*Сырны (масленічны) .................................... з 24 лютага да 1 сакавіка*
*Пасхальны (Светлы) .................................... з 21 да 26 красавіка*
*Троіцкі.............................................................. з 9 да 14 чэрвеня*

## Трапеза ў святы

*Паводле Царкоўнага статута, у святы Раства Хрыстовага і Богаяўлення, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, посту няма. У Навячэр'е Раства Хрыстовага, Навячэр'е Богаяўлення, у святы Уздзвіжання Крыжа Гасподняга і Усекнавення галавы Іаана Прадцечы дазваляецца ежа з алеем. У святы Стрэчання, Праабражэння Гасподняга, Успення, Нараджэння і Пакрова Прасвятой Багародзіцы, Увядзення Яе ў храм, Нараджэння Іаана Прадцечы, апосталаў Пятра і Паўла, Іаана Багаслова, калі яны прыпадаюць на сераду і пятніцу, а таксама ў перыяд ад Пасхі да Троіцы ў сераду і пятніцу дазваляецца рыба.*

## Дні асаблівага памінання спачылых

*Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў за веру Хрыстову ............................................ 9 лютага*
*Субота мясапусная .................................................. 22 лютага*
*Субота 2-га тыдня Вялікага посту............................ 15 сакавіка*
*Субота 3-га тыдня Вялікага посту............................ 22 сакавіка*
*Субота 4-га тыдня Вялікага посту............................ 29 сакавіка*
*Радаўніца.................................................................. 29 красавіка*
*Памінанне спачылых воінаў ...................................... 9 мая*
*Субота Троіцкая ........................................................ 7 чэрвеня*
*Субота Дзімітрыеўская ............................................. 1 лістапада*

## Не адпраўляецца вянчанне

*Напярэдадні серады і пятніцы ўсяго года (г. зн. па аўторках і чацвяргах)*
*Напярэдадні нядзельных дзён (г. зн. па суботах)*
*Напярэдадні двунадзясятых, храмавых і вялікіх святаў*
*На працягу пастоў Вялікага, Пятровага, Успенскага і посту перад Раством*
*На працягу Каляднага перыяду (ад 7 да 19 студзеня)*
*На працягу Сырнага тыдня (Масленіцы), пачынаючы з Нядзелі мясапуснай, і ў Нядзелю сырапусную*
*На працягу Пасхальнага (Светлага) тыдня*
*У дні і напярэдадні Усекнавення галавы Іаана Прадцечы — 11 верасня і Уздзвіжання Крыжа Гасподняга — 27 верасня*

# Іўдзейскія святы і пасты ў 2014 годзе

*16 студзеня Ту-бі-Шват — Новы год дрэў*
*13 сакавіка — пост Эстэр напярэдадні свята Пурым*
*16 сакавіка — Пурым, свята ў памяць аб цудоўным выратаванні іўдзеяў у Персідскім царстве*
*15–21 красавіка — Пейсах, свята ў гонар выхаду ізраільцян з Егіпта*
*27 красавіка — Дзень Катастрофы і Гераізму*
*18 мая — Лаг-Беоймер*
*4–5 чэрвеня — Швуойс — свята ў памяць Даравання Торы ізраільцянам на Сінае*
*5 жніўня — пост Тышо-бэоў (9 ава) у памяць разбурэння Храма вавіланянамі і рымлянамі*
*25–26 верасня — Рош-гашано — Новы год, дзень Суда і Літасці Усемагутнага*
*4 кастрычніка — Ём Кіпур — дзень Усеагульнага прабачэння, посту і малітвы*
*9–15 кастрычніка — Сукойс — свята ў памяць Паходу ізраільцян у пустэльні*
*16 кастрычніка — святы Шміні-ацэрэс і Сімхас-Тойра, завяршэнне восеньскіх святаў і пачатак новага чытання тыднёвых раздзелаў Торы*
*17–24 снежня — Ханука, свята ў памяць вызвалення Храма з рук грэкаў і здраднікаў, ачышчэння пасля апаганьвання і новага асвячэння Храма*

# Каталіцкі каляндар

*1 студзеня..................... Святой Багародзіцы Марыі*
*6 студзеня..................... Аб'яўленне Пана (Тры каралі)*
*12 студзеня................... Хрост Пана*
*2 лютага........................ Ахвяраванне Пана*
*5 сакавіка ..................... Папялец*
*19 сакавіка ................... Святога Юзафа*
*25 сакавіка ................... Звеставанне Пана*
*13 красавіка ................. Пальмовая нядзеля*
*20 красавіка ................. Вялікдзень*
*27 красавіка ................. Божай Міласэрнасці*
*29 мая ........................... Унебаўшэсце Пана*
*31 мая ........................... Адведзіны Найсвяцейшай Панны Марыі*
*8 чэрвеня ...................... Спасланне Духа Святога*
*15 чэрвеня .................... Найсвяцейшай Тройцы*
*19 чэрвеня .................... Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста*
*24 чэрвеня .................... Нараджэнне св. Яна Хрысціцеля*
*27 чэрвеня .................... Найсвяцейшага Сэрца Езуса*
*28 чэрвеня .................... Беззаганнага Сэрца Найсвяцейшай Панны Марыі*
*29 чэрвеня .................... Святых апосталаў Пятра і Паўла*
*2 ліпеня ......................... Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай*
*6 жніўня ........................ Перамяненне Пана*
*15 жніўня ...................... Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі*
*8 верасня....................... Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі*
*14 верасня .................... Узвышэнне Святога Крыжа*
*29 верасня .................... Святых Архангелаў*
*1 лістапада ................... Усіх Святых*
*2 лістапада ................... Успамін усіх памерлых вернікаў*
*23 лістапада ................. Хрыста, Валадара Сусвету*
*30 лістапада ................. Першая нядзеля Адвенту*
*8 снежня ........................ Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі*
*25 снежня ...................... Нараджэнне Пана*
*28 снежня ...................... Святой Сям'і*

# Лютэранскі каляндар

*1 студзеня............ Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса Хрыста*
*6 студзеня............ Богаяўленне, Эпіфанія*
*25 студзеня.......... Дзень абарачэння святога апостала Паўла*
*2 лютага............... Стрэчанне Гасподняе*
*5 сакавіка ............ Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу*
*7 сакавіка ............ Сусветны дзень малітвы*
*25 сакавіка .......... Дабравесце*
*13 красавіка ........ Вербная нядзеля*
*17 красавіка ........ Вялікі чацвер, Дзень усталявання Прычасця*
*18 красавіка ........ Пакутная пятніца*
*20 красавіка ........ Пасха, Уваскрэсенне Гасподняе*
*25 красавіка ........ Дзень евангеліста Марка*
*29 мая .................. Узнясенне Гасподняе*
*8 чэрвеня ............. Пяцідзясятніца, свята Сашэсця Святога Духа*
*15 чэрвеня ........... Тройца, свята Святога Трыадзінства*
*24 чэрвеня ........... Нараджэнне Іаана Хрысціцеля*
*25 чэрвеня ........... Дзень Аўгсбургскага веравызнання*
*29 чэрвеня ........... Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла*
*2 ліпеня ................ Дзень наведвання Марыяй Елізаветы*
*28 жніўня ............. Дзень памяці ахвяр палітычных рэпрэсій*
*21 верасня ........... Дзень апостала і евангеліста Мацвея*
*29 верасня ........... Дзень архангела Міхаіла і ўсіх анёлаў*
*5 кастрычніка ...... Свята падзякі за ўраджай*
*18 кастрычніка .... Дзень евангеліста Лукі*
*30 кастрычніка .... Дзень памінання ахвараў гвалту, вайны і тэрору*
*31 кастрычніка .... Дзень Рэфармацыі*
*19 лістапада ........ Дзень пакаяння і малітвы*
*23 лістапада ........ Дзень памінання спачылых. Нядзеля Вечнасці*
*24 снежня ............ Пярэдадзень Раства Хрыстовага*
*25 снежня ............ Раство Хрыстова*
*26 снежня ............ Дзень першапакутніка Стэфана*
*27 снежня ............ Дзень апостала і евангеліста Іаана*
*28 снежня ............ Дзень нявінна забітых немаўлят*
*31 снежня ............ Пярэдадзень Новага года*

# Мусульманскія святы і знамянальныя даты на 2014 год (1435 — 1436 год па Хіджрэ)

*12–13 студзеня (11–12 рабі аль-аваля) — Дзень нараджэння Прарока Мухамада (Маўлід ан-Набі)*

*25–26 мая (26–27 раджаба) — Узнясенне Прарока Мухамада (ноч Мірадж)*

*12–13 чэрвеня (14–15 шаабана) — Ноч ачышчэння ад грахоў (Лейлят аль-Бараа)*

*28 чэрвеня (1 рамадана) — пачатак мусульманскага посту (Ураза)*

*23–24 ліпеня (26–27 рамадана) — Ноч Прадвызначэння (Лейлят аль-Кадр)*

*28–30 ліпеня (1–3 шаваля) — Свята разгавення — Ураза-Байрам. Заканчэнне мусульманскага посту (святкаванне 3 дні)*

*3 кастрычніка (9 зуль-хіджа) — Дзень стаяння на гары Арафат*

*4–7 кастрычніка (10–13 зуль-хіджа) — Свята ахвярапрынашэння — Курбан-Байрам. Заканчэнне вялікага паломніцтва ў Меку (святкаванне 4 дні)*

*25 кастрычніка (1 мухарама) — пачатак новага 1436 года па Хіджрэ*

*3 лістапада (10 мухарама) — Ашура — дзень памінання пракокаў і пасланнікаў Алаха.*

*Даты календара могуць змяніцца ў залежнасці ад стану месяца.*

# СЕМ НЕЗАБЫЎНЫХ МЯСЦІН, ДЗЕ ВАРТА ПАБЫВАЦЬ КОЖНАМУ

**Прыемных падарункаў лёсу звычайна чакаюць на Новы год і Каляды — час, калі абавязкова здзяйсняюцца цуды. Але ж іншым разам мы забываемся, што гэтыя цуды знаходзяцца побач з намі штодня. Варта толькі расплюшчыць вочы і азірнуцца навокал, як становіцца зразумела: незвычайнае — паўсюль! «Звязда» склала свой невялікі (вядома, далёка не поўны і даволі суб'ектыўны) спіс цікавінак зямлі Беларускай, для спаткання з якімі не трэба чакаць свята. Зычым вам, паважаныя чытачы, каб сустрэчы з гэтымі сямю цудамі (як мінімум!) адбыліся ў вашым жыцці ў новым годзе!**

**1. Полацк**. Гэта — сапраўдны горад-цуд. Менавіта ён стаў цэнтрам першага дзяржаўнага ўтварэння на нашых землях — Полацкага княства. Старажытны Полацк калісьці быў месцам росквіту асветніцтва і культуры. Менавіта ён падарыў нам святую заступніцу зямлі Беларускай Еўфрасінню Полацкую і яе крыж (які хоць і знік, але, хочацца верыць, яшчэ вернецца на Беларусь), слаўнага першадрукара Францыска



Скарыну, паэта і грамадскага дзеяча Сімяона Полацкага... А колькі славутасцяў у адным гэтым невялікім па сучасных мерках гарадку! І Сафія, што «плыве над Дзвіною, нібы карабель», і Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр, і Богаяўленскі сабор, і езуіцкі калегіум... На гэтай зямлі ляжыць і Барысаў камень, у якога просяць здзяйснення жаданняў. І не дзіва, што ўсе шляхі вядуць у Полацк, бо менавіта тут усталяваны знак геаграфічнага цэнтра Еўропы (сам жа ён, на думку некаторых даследчыкаў, знаходзіцца недалёка ад горада, у раёне возера Шо).

**2. Белавежская пушча.** Адзін з самых старых запаведных лясных масіваў Еўропы, як стары суцэльны лес згадваецца яшчэ ў Іпацьеўскім летапісе 983 г. Тут ладзілі шыкоўныя паляванні вялікія князі, спрабавалі наладжваць



вытворчасць магнаты, а Кацярына II у часы Расійскай імперыі раздавала землі пушчы сваім прыбліжаным. Перажыў гэты чароўны лес і страшны паўгадавы пажар, і паўстанне каліноўцаў, і нямецкую акупацыю падчас Першай сусветнай вайны, калі яго багацці найбольш эксплуатаваліся. А падчас апошняй вайны тут было вырашана стварыць узорную паляўнічую гаспадарку рэйха. Нягледзячы на ўсё гэта, Белавежская пушча захавала сваё першабытнае аблічча і рэліктавыя супольнасці раслін і жывёл, многія з якіх беззваротна зніклі ў іншых месцах разам з высечанымі лясамі.



**3. Браслаўшчына.** Безумоўна, славіцца гэты рэгіён сваімі разнастайнымі азёрамі, з якімі звязана мноства праўдзівых і не вельмі гісторый. Але не толькі таямнічыя паданні і маляўнічы ландшафт вылучаюць Браслаўшчыну. Тут нібы нейкім волатам-сейбітам раскіданы валуны, шмат старажытных курганоў і — ужо збудаваных нашымі недалёкімі продкамі — незямной прыгажосці касцёлаў... Браслаўскі край адметны сярод іншых рэгіёнаў Беларусі сваім асаблівым духам, атмасферай шматвекавой мудрасці, захаванай у шатах лясоў і глыбіні азёр... Зачараванае месца, нібы асобны свет, дзе жыццё ідзе сваім мерным крокам і дзе няма мітусні. Тут, паглыбіўшыся ў абшары лясоў, блукаючы між люстэркаў азёр, нібы трапляеш у іншае вымярэнне і забываешся на ўсё.



**4. Палессе.** Вось ужо дзе рай для этнографаў! Гэты запаветны куточак прываблівае сваёй адметнай прыродай, самабытнасцю і мноствам старадаўніх традыцый, якія захаваліся толькі тут. Беларускае Палессе ўяўляе сабой дзіўны сінтэз архаічнага і сучаснага. Вялікі пласт культурнай спадчыны беларусаў захаваўся дзякуючы таму, што гэтыя балоцістыя мясціны заўжды былі цяжкадаступнымі. Палешукі спрадвеку жылі фактычна сваёй асобнай супольнасцю, іх сувязі са «знешнім» светам былі даволі слабыя. Таму і «масавая» культура, якая ахоплівала ў першую чаргу заходнія і цэнтральныя раёны нашай зямлі, на Палессе даходзіла досыць позна. Дзякуючы гэтаму яшчэ і сёння мы маем адметныя палескія дыялекты, непаўторныя традыцыі ткацтва і вышыўкі, своеасаблівую песенна-абрадавую культуру.

**5. Возера Свіцязь.** Пра ўзнікненне апетага Адамам Міцкевічам вадаёма існуе вялікае мноства легендаў. Але ж не толькі паданнямі славіцца возера Свіцязь. Самым загадкавым у ім з'яўляецца наяўнасць рэдкай раслiннай формы — яна завецца «тэтрадзініум яванікум». Цікава, што вода-



расці гэтыя сустракаюцца толькі ў водах каля вострава Ява ў Індыйскім акіяне. Адкуль жа яны ўзяліся ў Свіцязі — таямніца. Як і тое, што насяляе возера малюск «планорбіс стэльмахцікус», дагэтуль знойдзены толькі ў азёрах Францыі, Бельгіі і Германіі. А на ўзбярэжжы Свіцязі растуць рэдкія кветкі лабеліі Дортмана, занесеныя ў Чырвоную кнігу.

**6. Вялікі камень.** Той, каму выпадзе ехаць па дарозе з Шуміліна на Бешанковічы (Віцебская вобласць), можа збочыць на 500 метраў на захад ад вёскі Горкі. Паверце, такое адхіленне ад прамога маршруту вартае таго, каб пабачыць сапраўдны цуд прыроды — Вялікі камень. Гэты валун у 11 метраў даўжынёй, 5,6 метра шырынёй і 2,8 метра вышынёй (і гэта толькі надземная частка!) — самы вялікі на тэрыторыі Беларусі. Важыць «каменьчык», які па форме нагадвае прас,



больш за 800 тон. Трапіў ён да нас падчас апошняга абледзянення 18 тысяч гадоў таму з Выбаргскага масіву Балтыйскага шчыта. Існуе легенда, паводле якой адзін яўрэй родам з Віцебска схаваў за трыццаць крокаў ад каменя шкатулачку з каштоўнасцямі ўсіх яго продкаў. Ці праўда гэта — невядома, але і сёння ходзяць людзі да валуна з пачастункамі: прасіць, каб здзейсніліся жаданні.

**7. Тураўскія каменныя крыжы.** Не толькі ў Беларусі, але і па-за яе межамі вядомыя нерукатворныя каменныя крыжы, што вырастаюць наўпрост з зямлі на Барысаглебскіх могілках у Тураве. Шмат паданняў існуе пра іх узнікненне і цудадзейную сілу. Пра адзін крыж кажуць, што ён вырас на верагоднай магіле святога Кірылы Тураўскага, месца пахавання якога дакладна не выяўлена. А два камен-



ныя крыжы, што знаходзяцца ва Усіхсвяцкай царкве, згодна з легендай, прыплылі прыкладна ў 1170 годзе супраць цячэння па Дняпры і Прыпяці з Кіева. І, пэўна, няма ніводнага дня, каб да камянёў не прыйшлі паломнікі, што едуць сюды адусюль, каб папрасіць у іх вылячэння. Кажуць, што крыжы «рэагуюць» на кожнага чалавека па-свойму: нехта адчувае цеплыню, а хтосьці — холад. А тыя, хто жыве у граху, часам не могуць дакрануцца да каменя: іх быццам б'е токам.

*...Распавядаць пра незвычайныя куткі Беларусі можна бясконца, бо немагчыма абмінуць і слаўныя гістарычныя мясціны, і велічныя архітэктурныя помнікі, і прыродныя багацці, і шэраг іншых матэрыяльных і духоўных здабыткаў прашчураў і сучаснікаў. А калі паварушыць зжаўцелыя старонкі гісторыі нашага краю, то колькі яшчэ ўсяго невядомага і таямнічага можна знайсці! Пэўна ж, у кожнага ёсць свой уласны «спіс» цудоўных месцаў і рэліквій. Дык ці не сапраўдны гэта цуд — жыць на зямлі, такой багатай на славутасці?*

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**



**Віктар ШНІП, паэт:**

*— Усё сваё жыццё мае бацькі выпісвалі «Звязду». І мая сям'я ўжо гадоў дваццаць пяць чытае яе. І, вiншуючы чытачоў газеты з Новым годам і Калядамі, зычу ўсім самага галоўнага — моцнага здароўя! Не спакушайцеся на прыгожае чужое, бо наша роднае не горшае, а найлепшае, бо яно ад прадзедаў спакон вякоў нам засталося. І мова, і музыка, і карціны, і замкі, і храмы, і помнікі, і сцяжынкі ў лузе ды крыніцы, дзе пяе салавей. Ганарыцеся тым, што вы жывяце ў цэнтры Еўропы, і будзьце еўрапейцамі, бо мы беларусы — еўрапейскі народ. Чытайце ў новым годзе родную газету на роднай мове — «Звязду»!*



**Алег ХАМЕНКА, спявак, музыкант, лідар гурта «Палац»:**

*— Ад шчырага сэрца, ад гурта «Палац» і ад сябе асабіста віншую ўсіх чытачоў «Звязды» з калядными святамі, Раством і Новым годам! Хачу пажадаць усім натхнення, кахання, любові, плёну, здароўя, дабрабыту! У гэты сакральны час, калі мы збіраемся разам, каб ушанаваць рух ад мінулага да будучыні, вельмі важна захаваць традыцыі нацыянальнай спадчыны. Усіх, хто будзе адзначаць калядныя святы вечар, запрашаем 6 студзеня далучыцца да нашага карнавальнага шоу «Каляды ў вялікім горадзе». З прачыстым Раством, з прасветлымі Калядамі!*

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 СНЕЖНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 245 (27610) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

*Па надзею, па радасць, па шчасце!*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

Адыходзячы год адлічвае апошнія хвіліны... Зусім хутка мы збяромся разам са сваімі роднымі і блізкімі, каб аддзячыць яму за ўсё добрае і пад бой курантаў падняць келіхі за год надыходзячы. На некалькі імгненняў мільёны людзей з'яднаюцца ў адзіным парыве, адзіным памкненні — данесці да нябёсаў свой самы важны пасыл.

Мы адкінем усё дробязнае і другараднае, каб у навагоднюю ноч засяродзіцца на галоўным. Што гэта будзе? Здароўе, каханне, прызнанне, грошы?.. Даўгалецце бацькоў, уладкаванасць дзяцей, паразуменне з блізкімі, памнажэнне дабрабыту? У гэты момант кожны падумае пра сваё, але ўсе мы — маладыя і сталыя, мудрыя і наіўныя, акрыленыя і прыземленыя, вернікі і атэісты — будзем марыць пра цуд. Той самы цуд, які пасылаецца не ў якасці ўзнагароды за добрыя паводзіны, а проста так, без усялякіх умоўнасцяў. І тады... Звычайны гарбуз ператвараецца ў карэту, сціплае адзенне — у каралеўскія строі, двухпакаёўка — у палац... Злыя становяцца добрымі, сквапныя — шчодрымі, бедныя — багатымі, а дурні — разумнымі...

У прынцыпе, нічога невыканальнага і нерэальнага ў нашых жаданнях няма. Толькі чамусьці вельмі хочацца, каб над іх увасабленнем «папрацаваў» нехта іншы — дзесьці там, у іншым вымярэнні. І потым «явіў» нам цуд.

...Апошнія хвіліны адыходзячага года. Мы запальваем свечкі і загадваем жаданні, выдатна разумеючы, што прыкладаць намаганні для іх увасаблення давядзецца самім. Пакуль жывём, мы вучымся быць чараўнікамі і рабіць тое, што ў нашых сілах, — для сябе, для блізкіх, для знаёмых і незнаёмых людзей. А ў выніку адбываюцца цуды — самыя сапраўдныя, зямныя... Верце ў іх і заўсёды спадзявайцеся на лепшае! Менавіта гэтага, дарагія чытачы, зычаць вам у Новым годзе супрацоўнікі «Звязды» і героі нашага святочнага нумара.

*Каляды...*
*Святы*
*ў шумным*
*карагодзе...*
*Прыждалі мы*
*Чароўнае пары —*

*Зноў Новы год...*
*А што?*
*Няхай прыходзіць!*
*Адно —*
*хай будзе лепшы,*
*чым стары!*

Валянціна ДОЎНАР.

ISSN 1990 - 763X

# АНЁЛ-АХОЎНІК ГАННЫ БЯРСЕНЕВАЙ

**Усе раманы папулярнай расійскай пісьменніцы Таццяны Сотнікавай, вядомай пад псеўданімам Ганна Бярсенева, — пра пошук шчасця, нюансы чалавечых узаемаадносін і каханне. Але жыццё і лёс самой Таццяны, з якой мы знаёмыя са студэнцкіх гадоў, калі вучыліся яшчэ на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, — таксама гісторыя моцных пачуццяў. І яшчэ якіх! Дарэчы, Таня — наша зямлячка, яе дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Мінску, тут жывуць яе родныя і блізкія.**

## Студэнцкаму каханню сказалі «так»

***— Таня, гісторыі кахання тваіх герояў часцей за ўсё заканчваюцца шчасліва. Але ты неяк сказала, што самая дзіўная гісторыя кахання, якую ты ведаеш, — твая ўласная, і яе версіі ты расказваеш у сваіх кнігах...***

**«Нягледзячы на бытавы жах, які можна вынесці толькі па маладосці, у нас збіралася вялізная колькасць творчых людзей, было вельмі яркае, насычанае жыццё».**

— Што датычыцца шчаслівага заканчэння... Вось на здымках фільма «Ярмолавы», сцэнарый якога я напісала паводле сваёй трылогіі, падыходзіць да мяне касцюмер і кажа: "Я прачытала сцэнарый, так усё цікава. Але чаму ж усе жанчыны такія няшчасныя?" Таму тое, што ва ўяўленні аднаго чалавека — шчасце, ва ўяўленні іншага, можа, такім не лічыцца...

Я раздаю героям свае ўяўленні пра каханне. Таму што ўласную гісторыю я не апісвала напрамую нідзе. Яна якраз даволі звычайная: з мужам Валодзем мы пазнаёміліся на студэнцкай «бульбе». Абое — студэнты журфака БДУ: мне — 17 гадоў, яму — 20. Што было не як ва ўсіх, дык гэта тое, што наш студэнцкі раман доўжыцца шмат гадоў.

## Пакой у камуналцы

***— Калі Валодзя паступіў у Літінстытут, ты з двухгадовым старэйшым сынам Ванем паехала за ім у Маскву... Вам прыйшлося пачынаць з нуля...***

— Нават з мінуса, я сказала б... Валодзя падпрацоўваў дворнікам, і яму далі пакой у камуналцы на Малой Дзмітраўцы. Я нават не ўяўляла, што бывае такое: пакоі з выбітымі вокнамі, клапы, суседзі-кіргізы, якія невядома чым займаліся... Але, нягледзячы на бытавы жах, які можна вынесці толькі па маладосці, у нас збіралася вялізная колькасць творчых людзей, было вельмі яркае, насычанае жыццё. Год пражыўшы ў Маскве (а гэта было вельмі няпроста, таму што існаваў інстытут прапіскі, прыходзіў участковы і ледзь ці не з ложка мяне сцягваў, крычаў, каб я адсюль з'язджала), я зразумела, што вось так боўтацца, нават маючы журфакаўскі дыплом, нават падпрацоўваючы ў "Литературной газете", — немагчыма. Патрэбна легалізацыя. І гэта аказалася ўдалай думкай: я паступіла ў аспірантуру Літінстытута, мы перабраліся ў студэнцкі інтэрнат. А потым адбылося няшчасце...

## Выратавала каханне

***— Калі цябе збіла машына з п'яным кіроўцам і табе, 26-гадовай, ампутавалі нагу — што дапамагло выжыць?***

— Калі б я была балерынай або фігурысткай, адчай быў бы велізарным. Але я разумела, што тым, чым займаюся, я магу займацца і далей. Тым больш тагачасны рэктар Літінстытута Яўген Сідараў запрасіў мяне ў іх выкладаць, і гэта мяне вельмі падтрымала. Потым дапамог нам і з кватэрай. Адчуванне жаху было, але я разумела: мне пашанцавала! Бо на той прагулцы я была з Ванем і цудам паспела адштурхнуць сына ўбок.

***— Можа, анёл-ахоўнік быў побач?***

— Нічым іншым я гэта растлумачыць не магу. Пры тым, што нагу прыйшлося ампутаваць, у мяне не было ні сінякоў, ні ўдараў. Містыка! Ну і потым муж Валодзя проста «перасяліўся» ў «Скліф», два з паловай месяцы ад мяне не адыходзіў... І пасля выпіскі таксама, таму што па першым часе мне здавалася: усё, я цяпер нікуды не змагу выйсці. Нават паход на агульную кухню ў інтэрнаце ператвараўся ў цэлае мерапрыемства. Але паступова стала ўсё наладжвацца: знайшлі майстра, які зрабіў прыстойны пратэз, я пачала працаваць. А праз некалькі гадоў другі сын нарадзіўся, Даня.

**«Па першым часе мне здавалася: усё, я цяпер нікуды не змагу выйсці. Нават паход на агульную кухню ў інтэрнаце ператвараўся ў цэлае мерапрыемства».**

## Два тыдні «зняволення»

***— Цяжка было на другое дзіця асмеліцца?***

— Проста мы хацелі дваіх дзяцей, і, калі высветлілася, што я цяжарная, вырашылі: нараджаем! І не пашкадавалі аб гэтым ні разу. Хоць было няпроста, таму што да паўтара года Дані мы яшчэ жылі ў інтэрнаце. А потым ад Саюза пісьменнікаў пабудавалі вось гэтую кааператыўную кватэру на 14-м паверсе. У новы дом заехалі першымі. Валодзя ўгаварыў ліфцёра на гадзіну ўключыць ліфт, каб падняць рэчы. І два тыдні, пакуль ліфты не ўключылі канчаткова, я сядзела з дзецьмі ў кватэры невылазна.

***— Калі чалавек патрапіў у трагічную сітуацыю, а падтрымаць яго няма каму, дзе шукаць апору?***

— Думаю, апора толькі ўнутры самога чалавека. Як гаварыў Цютчаў: «Шчаслівы той, хто кропку Архімеда здолеў знайсці ў сабе самім». Здарылася з табой бяда — гэта момант праверкі: ёсць гэтая апора або няма. Напрацаваў ты яе за сваё жыццё або не здолеў.

Дзеці часам злуюцца, што бацькі прымушаюць іх чытаць. Яны не разумеюць: іх хочуць напоўніць унутрана з розных крыніц. Каб, калі жыццё да іх падступіць з нейкай цяжкай сітуацыяй, яны не зламаліся.



*Ганна Бярсенева (Таццяна Сотнікава) — аўтар раманаў «Французская жонка», «Узрост трэцяга кахання», «Антысцерва» і дзясяткаў іншых, сцэнарыяў да серыялаў «Ярмолавы», «Варажба пры свечках», «Капітанскія дзеці» і іншых, якія зняты паводле яе твораў з удзелам такіх акцёраў, як Уладзімір Сіманаў, Вольга Астраумава, Ада Рогаўцава, Аксана Акіньшына... А 12-серыйны фільм «Вангелія» з Аленай Якаўлевай у ролі знакамітай прадказальніцы Вангі, які з поспехам прайшоў на Першым беларускім тэлеканале, быў зняты паводле сцэнарыя Таццяны і яе мужа Уладзіміра Сотнікава.*

## «Таня, напішыце дэтэктыў»

**— У цябе была цалкам стабільная прафесія, але ты пусцілася ў вольнае плаванне...**

— Не магу сказаць, што знаходжуся зусім у вольным плаванні: я дацэнт, і адзін дзень на тыдзень выкладаю ў Літінстытуце. А як некалі было... Памятаеш, якая ў 1994-м сітуацыя склалася? Людзі спрабавалі сябе ў розных сферах. Я таксама шукала спосабы зарабіць. Але хацелася знайсці нешта такое, што было б звязана з тым, чаму я вучылася. Калі мне прапанавалі напісаць кнігу, я разгубілася. Таму што літаратуразнаўства — гэта адно, а мастацкая творчасць — зусім іншае. Але вырашыла паспрабаваць. Адтуль, уласна, і псеўданім, — бо не была ўпэўнена, што буду працягваць. Але да трэцяй кнігі я зразумела: занятак захоплівае мяне настолькі, што незалежна ад таго, будзе поспех або не, я ўсё роўна буду гэтым займацца. А пасля дэфолту 1998-га — лясь! — і закрываюцца ўсе выдавецкія серыі, акрамя адной, дэтэктыўнай. Мне дырэктар выдавецтва кажа тады: «Таня, напішыце дэтэктыў, я нават не буду яго чытаць. Адразу ў друкарню». Але ў мяне было адчуванне адказнасці перад тым, што я хачу зрабіць. І перад героямі, якіх прыдумала.



**«Арганізм проста «асыпаўся». Усё, што магло адрэагаваць у ім хваробай, — адрэагавала. Я заўсёды кнігі дапісваю ў такім стане, па-іншаму нельга: яны патрабуюць шмат эмацыянальнай аддачы».**

І за гэта прыйшлося плаціць: чатыры гады кнігі не выходзілі наогул. Я тады прыдумляла іх для сябе...

***— Табе знаёмы стан выціснутага лімона?***

— Яшчэ як! Я дапісвала раман «Глашачка», спазнялася з тэрмінамі і літаральна не ўставала з-за стала. І калі дапісала, ледзь не памерла ад ацёку Квінке — патрапіла ў бальніцу з моцным алергічным прыступам. Прычым ні на што! Арганізм проста «асыпаўся». Усё, што магло адрэагаваць у ім хваробай, — адрэагавала. Я заўсёды кнігі дапісваю ў такім стане, па-іншаму нельга: яны патрабуюць шмат эмацыянальнай аддачы. Таму стараюся ў такі момант на дачы знаходзіцца, сярод прыроды. Так лягчэй.

## Шчасце быць шчаслівым

***— Вы з Валодзем разам больш як 30 гадоў. У чым сакрэт доўгіх адносін?***

— Думаю, у здольнасці абаіх да ўнутранага развіцця. Тады кожны дзень ты маеш справу з новым чалавекам. Табе не сумна з ім, ты не прывыкаеш, таму што ён кожны раз іншы. І ты іншая.

***— Па-твойму, што такое шчасце?***

— Здольнасць быць шчаслівым. Я бачыла вельмі шмат людзей, не здольных зведваць шчасце. У іх усё ёсць, а нічога не радуе. Яны спустошылі сваю душу. Гэта мёртвыя людзі.

**Ларыса ЗІНЬКЕВІЧ.**

---



**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, пісьменнік, радыё- і тэлевядучы:**

*— Вельмі хочацца пажадаць, каб Новы год прынёс людзям шмат радасці, здзяйсненняў і новых набыткаў у працы, у вучобе, у асабістым жыцці. Хацелася б, каб на свет з'явілася шмат новых беларусаў. А яшчэ, каб беларуская мова пашырыла сваё існаванне ва ўсіх сферах нашага жыцця. І каб чытачоў у выданняў холдынга «Выдавецкі дом «Звязда» стала ў новым годзе значна больш!*

# ЗАЛІК ПРЫМАЎ... ДЗЕД МАРОЗ

**Гэтая гісторыя здарылася з маім сябрам Раманам, калі ён вучыўся на трэцім курсе ва ўніверсітэце. Хлопец пацíху збіраў грошы на матацыкл і таму актыўна шукаў хоць нейкую працу. Ды і пастаянна прасіць дапамогі ў бацькоў не хацелася, тым больш што на двары стаяў памятны эканамічны крызіс 2011 года.**

Але з-за вельмі пераменлівага раскладу занятак вольным заставаўся хіба што начны час. Уладкаваўся хлопец вартаўніком у дзіцячы садок і адпрацаваў там два месяцы. А тым часам непрыкметна падышла зімовая сесія. Раман рыхтаваўся да залікаў па начах. Вучыўся ён на тэхнічным факультэце, дзе трэба разбірацца ў чарцяжах, формулах,ураўненнях... А часу на дасканалую падрыхтоўку па ўсіх прадметах хранічна не хапала.

Як вядома, існуюць прадметы, якія вывучаюць усе студэнты — без розніцы, «тэхнары» яны ці гуманітарыі. Адносіцца да іх і паліталогія. Прадзірацца праз гушчар асаблівасцяў палітычных рухаў і аналіз аб'ёмных прац навукоўцаў пасля профільных прадметаў у хлопца сіл ужо не было. Сяк-так ён цягнуў гэты цяжар на семінарскіх занятках, але залік з першага разу не здаў.

І вось — пераздача паліталогіі, прызначаная на 30 снежня. Раман, зразумела, спадзяваўся больш на ўдачу, чым на свае веды. Прыйшоў пажылы выкладчык, расклаў білеты, загадаў цягнуць... Студэнты пачалі рыхтавацца да адказу. Выкладчык хвілін пяць, пагладжваючы бараду, аб нечым думаў, а потым выдаў:

— А чым я горшы за Дзеда Мароза? Давайце ўсе залікоўкі сюды...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




# ЦЭПЕЛІН — НА ТАЛЕРКУ!

**Смачна есці ў Новым годзе! Шаноўныя чытачы, галоднымі са «Звяздой» вы дакладна не застанецеся. Урачыста, пад бой курантаў, мы распачынаем новую рубрыку — «Смакі Кухмістра Верашчакі». У ёй шаноўны знаўца беларускай старадаўняй кухні Алесь Белы будзе нам распавядаць, як гатаваць найлепшыя нацыянальныя стравы. А сёння (як падарунак да свята) майстар-клас па прыгатаванні цэпелінаў праўдзе яго маці Валянціна Іванаўна.**


Валянціна і Алесь Белыя.

Хто не ведае, цэпеліны — гэта вялізныя бульбяныя клёцкі з мясам. Чаму мы выбралі на Новы год менавіта іх? Ды як жа, дранікі ўжо крыху паднадакучылі, а бульбашамі, як ні круці, мы застанёмся і ў 2014 годзе. Таму... Нож і тарку ў рукі, пару кілаграмаў бульбы ставім каля ног — і наперад!

Цэпеліны вельмі смачныя і каларыйныя. У сям'і Белых іх заўсёды гатавалі на святы. Да таго ж страва старажытная, гатавалася на Беларусі не адно стагоддзе, таму смак сапраўднага свята яна перадасць дакладна. Такім чынам...

**1.** Чысцім кілаграмы два бульбы, надзіраем яе на тарцы (можна прапусціць праз блендар, так будзе значна хутчэй). Чысціць бульбу на Новы год усё адно некаму прыйдзецца, дык што там два лішнія кілаграмчыкі!

**2.** На каструлю ці вялікую місу кладзём друшляк, засцілаем яго марляй. Тарказаную бульбу порцыямі змяшчаем у марлю і рукамі адціскаем з яе сок. Мякаць, якая атрымліваецца ў выніку, высыпаем у асобны посуд. Паўтараем працэс з наступнай порцыяй. Паралельна можна ўявіць, што гэта такі бульбяны беларускі снег, зляпіць некальки сняжкоў і запусціць імі ў сваіх хатніх. Толькі не загуляйцеся, пакіньце штосьці на цэпеліны.

**3.** Сок, які сабраўся пад друшляком, зліваем. На дне посуду атрымліваецца гатовы крухмал (з выгляду ён нагадвае смятану). Дадаем яго ў адціснутую бульбяную масу, каб добра ляпілася. Калі бульба занадта вадзяністая, на ўсякі выпадак уліваем яшчэ крыху разведзенага вадой крухмалу, купленага ў краме. Гэта каб быць упэўненым, што цеста будзе клейкім (ніякіх яек туды не кладзем). Солім, старанна перамешваем рукамі. Трэба атрымаць такое цеста, якое б добра ляпілася і не цякло. Бульбяны сок нам не спатрэбіцца. Таму можаце пакінуць яго асобна і ў якасці розыгрышу за навагоднім сталом даваць поўныя чаркі з ім тым, хто пераможа ў конкурсах.


Цэпеліны.

**4.** Цяпер гатуем начынку. Для гэтага найлепш падыдзе свініна. Сала ў ёй павінна быць не надта шмат — дзесьці чацвёртая ці пятая частка. Мяса наразаем нажом на невялічкія кубікі (Валянціна і Алесь Белыя ўпэўнены, што так атрымліваецца значна смачней, чым тады, калі выкарыстоўваецца фарш). У мяса кідаем нашынкаваную цыбулю, солім, добра перамешваем. Начынка для цэпелінаў гатова — нічога складанага.

**5.** Далей самае прыемнае — лепка. Бяром добры кавалак бульбянога цеста (бо нашы цэпеліны будуць досыць вялікімі), кладзем на далонь і расплюшчваем. Яшчэ кавалачак цеста на сярэдзіну, а зверху — мясную начынку. Колькі мяса класці, вырашайце самі, але не трэба занадта шмат, каб яны пасля не лопнулі. Залепліваем краі цэпеліна, старанна мнем яго з усіх бакоў, каб атрымаўся ідэальна гладкім. Цяпер кожны гатовенькі цэпелін кладзем на драўляную дошчачку асобна, так, каб ён не датыкаўся да іншага.

**6.** Ставім на газ ваду, солім, кідаем кавалак цыбуліны (каб водар у цэпелінаў быў яшчэ больш прыемны, ды і смак жыжкі лепшы). Па адной кідаем кожную клёцку. Пасля лыжкай правяраем, каб не зліпліся. Праз пэўны час яны ўсплывуць. Аднак гэта яшчэ не азначае, што ўсё гатова. Цэпеліны можна даставаць з вады тады, калі яны набудуць цёмна-шэры колер.

**7.** Цэпеліны можна падаваць разам з жыжкай або на талерцы са смятанай. Ёсць і трэці варыянт — крыху падсмажыць на бляхе з тлушчам, каб яны набылі залацісты колер. Такія вось зімовыя сонейкі ў вашай утульнай хаце.

Цэпеліны надзвычай сытныя, таму іх можна падаваць замест аднаго гарачага як мінімум. Бульба ў іх мае асаблівы, крыху «гумовы» смак — і гэта незвычайна! Іх гатавалі яшчэ нашы продкі, таму і вы асіліце.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Любові БЛЯЛЯЕВАЙ.**

**P.S.** *Сябры! На нашым сайце zviazda.by вы можаце паглядзець відэа майстар-класа Валянціны Белай па прыгатаванні цэпелінаў, а таксама знайсці гэты рэцэпт з пакрокавым фота.*

---

■ За навагоднім сталом

# РУЧНІКІ

**Песня ўпрыгожвае любое свята. У час спеву душа прасвятляецца, робіцца адкрытай, радасна-ўзнёслай. А ў навагоднюю ноч яна яшчэ і ахінаецца міфічна-фальклорнай таямнічасцю, загадкавай рамантыкай. Каб навагоднія пажаданні спраўдзіліся, трэба іх акрыліць добразычлівай усмешкай, бяседнай весялосцю і замацаваць супольнай песняй. Бо не багаты стол, не рознакаляровыя гірлянды, не бліскучае зззянне блакітнага экрана яднаюць грамаду. Робіць яе трывалай той дух, што ўзнікае з непасрэднай шчырасці, з агульнага спеву...**

Вакальны твор «Ручнікі» Веры Вярбы і Міколы Пятрэнкі займае годнае месца ў нашай духоўнай культуры. Як толькі ён прагучаў на аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Віцебску (а гэта было ў 1959 годзе), то яго адразу падхапілі іншыя самадзейныя артысты з усёй рэспублікі, уключылі ў рэпертуар прафесійныя спевакі. Песня стала сапраўды народнай, нават на першых яе грамзапісах пазначалі як фальклорную.

У часопісе «Полымя» увагу Міколы Пятрэнкі, самадзейнага кампазітара, прыцягнуў верш «Ручнікі» Веры Вярбы, студэнткі Белдзяржуніверсітэта. Яго кранулі і сюжэтны тэкст, і дасціпны дыялог, што грунтуюцца на фальклорнай сімволіцы. Ручнік сімвалізуе ўтульнасць хаты, гасціннасць яе гаспадароў, повязь пакаленняў аднаго роду-племені і ўсіх перыядаў існавання кожнага з іх. Ён выступае своеасаблівым сцягам і абярэгам усёй сям'і. А вада — гэта жыццё, і рака ўспрымаецца той дабратворнай плынню, якая жывіць усё наваколле, поўніць яго цудадзейнай энергіяй — каханнем. Таму гучыць не «выпусціла» (як патрабуецца ў беларускай мове), а «ўпусціла дзеўка беленькі ручнік», гэта значыць забылася пра сямейныя патрабаванні і кінула ў неспакойную плынь асабістага кахання. І пацалунак выглядае не праявай юнацкай жарсці, а ахоўнікам узніклых стасункаў між каханкамі, які аберагае іх ад спакуслівай вірлівасці, дзе можна і «ўтапіцца».

У выкананні «Песняроў» злучнік «што як» (перадаецца і лёгкі гумар хлопца, і варыянтнасць працягу адносін) заменены на «бо», што, безумоўна, спрошчвае сэнс выказвання (але лягчэй спяваць). Існуюць і варыянты выяўлення паводзін каханкаў. «Цалавала Лена Янку над вадой» — выкананне просьбы. Але аўтары схіляюцца да адлюстравання актыўнасці юнака ў істотных момантах любасці, яго жадання быць настойлівым і галоўным — і гучыць: «Цалаваў Алёну Янка над вадой».

**РУЧНІКІ**

*Верш Веры ВЯРБЫ*
*Музыка Міколы ПЯТРЭНКІ*

*У суботу Янка ехаў ля ракі,*
*Пад вярбой Алёна мыла ручнікі.*
*— Пакажы, Алёна, броды земляку,*
*Дзе тут пераехаць на кані раку?*

*— Адчапіся, хлопец,*
*едзь абы-куды,*
*Не муці мне*
*толькі чыстае вады, —*
*У маркоце Янка галавой панік,*
*Упусціла дзеўка беленькі ручнік.*

*— Янка, мой саколік,*
*памажы хутчэй,*
*Ой, плыве знікае*
*ручнічок з вачэй.*
*— Любая Алёна, я вады баюсь,*
*Пацалуй спачатку,*
*што як утаплюсь?*

*Супыніўся гнеды*
*пад вярбой густой,*
*Цалаваў Алёну Янка над вадой.*
*Стала ціха, ціха на усёй зямлі*
*Па рацэ далёка ручнікі плылі...*




Мікола Пятрэнка, выкладчык беларускай мовы і літаратуры, аўтар метадычных артыкулаў і кніг, напісаў больш за 200 песень. Сярод іх — «Твае рукі», «Ой, старонка, мая ты лясная», «Я — беларус». Але ніводная з іх не набыла такой папулярнасці, як «Ручнікі». Яна будзе вясёлай і разважлівай прыўкрасай навагодняга застолля.

**Падрыхтаваў**
**Міхась ШАВЫРКІН**

---

**Аксана ВЕЧАР,**
**тэлевядучая «Беларусь 3»:**

*— Мне хацелася б, каб людзі, нягледзячы ні на што, не пераставалі верыць у цуды. Каб былі побач тыя, хто ўмее і жадае падтрымліваць гэтую веру. Дарыце адно аднаму адчуванне свята, казкі. Такія рэчы часцей за ўсё ёсць у дзяцінстве, а вось з узростам мы пра іх забываем. А Новы год — гэта чароўны час, калі кожны можа адчуць сябе дзіцем. Няхай усе вашы мары і жаданні спраўдзяцца!*



---

У гэты цудоўны пераднавагодні дзень сардэчна віншуем былую супрацоўніцу газеты, рэвізійнага карэктара з вялікім працоўным стажам **Алу Сільвестраўну САБАЛЕЎСКУЮ** з юбілейным днём нараджэння!

Зычым моцнага здароўя і даўгалецця, шчасця і дабрабыту, мудрасці, не старэць душой, з усмешкай і добрым настроем працягваць свой шлях па жыцці.

*Жадаем быць*
*заўжды багатай —*
*Багатай шчасцем і спакоем,*
*Здароўем, радасцю ў сям'і*
*І ўсім прыгожым на Зямлі.*

**Звяздоўцы.**

**За некалькі гадзін да Новага года!**

Віншуем **ветэранаў былога калгаса імя Энгельса, а цяпер хлебаробаў СВК у Дзеткавічах** з Новым годам і Калядамі. Дзякуй Вам за стараннасць у працы, любоў да роднай зямлі-карміцелькі. Жадаем усім здароўя, святочнага настрою, упэўненасці ў заўтрашнім дні.

**З павагай,**
**Міхаіл Міхайлавіч НОВІК,старшыня праўлення СВК «Агра-Дзеткавічы» Драгічынскага раёна.**

*УНП 200098373*

■ Сімвал года

# У ГАСЦЯХ У ПАСАТА



Карэспандэнт «Звязды» даведалася, каму пашчасціць у год Каня

**Сёння Магілёўскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па конным спорце і сучасным пяцібор'і ператварыўся ў навагоднюю пляцоўку для дзіцячых святочных мерапрыемстваў. Ад іншых ранішнікаў яны адрозніваюцца нават па сцэнарыі. Ну дзе яшчэ можна пабачыць, як салодкія падарункі да ёлкі падвозіць маленькі, падобны да канька-гарбунка поні? А Дзед Мароз з'яўляецца ў святочнай зале, як і належыць, на казачным фаэтоне, наперадзе якога гарцуе самы сапраўдны конь. Але галоўная цікавінка тутэйшага свята ў тым, што, акрамя забаўляльных гульняў з Дзедам Марозам, Снягуркай і Губкай Бобам вакол высачэзнай ёлкі, ёсць магчымасць праехацца на сімвале надыходзячага года вярхом.**

— І гэта вельмі добры знак, — адзначае дырэктар цэнтра Віктар Целяпушкін.

А не паверыць гэтаму чалавеку, які ведае пра коней, мабыць, усё, нельга. Неверагодна, але галоўны ў Магілёве «канязнаўца» нават служыў у кавалерыйскім палку пад Масквой. Зараз полк — прэзідэнцкі, а быў створаны, кажуць, па ініцыятыве Бандарчука-старэйшага пры «Масфільме», калі той здымаў «Вайну і мір». Мой суразмоўца смяецца, што прымаў удзел ва ўсіх кінастужках з коньмі, якія ствараліся ў 1987—1989 гадах. Дарэчы, за ім быў замацаваны конік, на якім скакаў адзін з герояў кінастужкі «Гардэмарыны, уперад!» Гэты кадр мільгае на экране долю секунды, але Віктар пазнае былога сябра.



Віктар Целяпушкін са сваім улюбёнцам Пасатам.

### Як Пасат зламаў немцу сківіцу, а Залім адгадаваў жывот

Кіраўнік цэнтра можа часамі казаць пра сваіх улюбёнцаў. І нават параўноўвае іх з аўтамабілямі. Трактар, напрыклад, для таго і існуе, каб цягаць плуг. У яго павінны быць вялікія колы, магутны рухавік. А ў гоначных — іншая сістэма. Так і коні. Ёсць тыя, якім наканавана быць працоўнымі, на якіх аруць і сеюць, а ёсць спартыўныя, якія павінны ўдзельнічаць у спаборніцтвах. У цэнтры знаходзяцца скакуны выключна верхавых парод — тракены, галшціны, гановеры, чыстакроўныя рысакі.

І самы вядомы з іх — тракен Пасат. Ён прымаў удзел у 2 алімпіядах, а сёлета на чэмпіянаце Еўропы паказаў самы лепшы вынік, што дазволіла беларускай камандзе заняць 10-е месца. Дарэчы, гэта адзіны ў рэспубліцы конь, які мае кваліфікацыйны вынік для ўдзелу ў чэмпіянаце свету. «Пасат — гэта асоба! Гэта — характар!» — з захапленнем кажа пра свайго ўлюбёнца дырэктар цэнтра. Гэты «характар» нават каштаваў аднаму немцу выбітай сківіцы. На алімпіяду ў Пекін Пасата разам з іншымі конямі везлі з Германіі — такія былі ўмовы. Прычым спартсмены павінны былі ляцець на адным авіялайнеры, а коні — на другім. Пасадкай жывёл займаліся спецыялісты, але яны не ведалі, які нораў у магілёўскага скакуна. Немец не вельмі далікатна пачаў заганяць яго ў салон, той і садануў крыўдзіцеля.

А вось Залім з тых коней, якія заўсёды не супраць перакусіць. Забаўны выпадак здарыўся падчас спаборніцтваў у Бельгіі. У якасці падсцілкі для скакуноў у Магілёве выкарыстоўваюцца апілкі, а там была салома. І Заліму яна так спадабалася, што ён за ноч яе з'ядаў. Усе былі ў шоку. Думалі, конь недаядае. Пакуль разбіраліся, у яго жывот вырас. Як такому ў спаборніцтвах удзельнічаць? Заліма тут жа перавялі на строгі рацыён, а салому замянілі на апілкі. Але пасля гэтага выпадку бельгіец, які дзяжурыў на стайні і таксама меў добры жывоцік, калі бачыў Заліма, стукаў сябе па жываце і казаў са смехам: «Брат, брат».



Поні Чыпа — самы маленькі жыхар магілёўскага цэнтра.

### Яны такія ж, як і мы

І Віктар Целяпушкін можа прывесці шмат прыкладаў, каб пераканаць у гэтым чалавека. Калі да чалавека ставіцца з непавагай, ён часцей за ўсё помсціць. Жывёлы — таксама. Аднойчы ў секцыю прывезлі саўгаснага каня, які... кусаўся. Як потым высветлілася, яго прымушалі шмат працаваць, а кармілі дрэнна. Ды яшчэ білі. Калі ўмовы жыцця змяніліся, яго пачалі добра карміць і даглядаць, ён нават забыўся, як кусацца.

Лянуецеся працаваць, калі ніхто не прымушае? Сярод коней таксама сустракаюцца лянівыя. І часцей за ўсё ад гэтага пакутуюць неспрактыкаваныя коннікі, якія прыходзяць у цэнтр пакатацца. Для пракату ім падбіраюць найбольш пакладзістых коней, але не ўсе з іх... добрасумленныя. Бывае, конь давязе да кута манежа і спыніцца: адчувае, што на ім сядзіць «чайнік». Наезнік будзе нясмела тузаць яго рукой ці нагой, а той нават і вухам не павядзе. Стаіць сабе — адпачывае. І так — пакуль не ўмяшаецца інструктар.

А вось Жора — з шэрагу лекараў, вельмі добры і спакойны. На ім дзеці-інваліды займаюцца іпатэрапіяй. Прыходзяць такія хворыя хлопчыкі і дзяўчынкі, на якіх без слёз бывае цяжка глядзець, але праз нейкі час іх не пазнаць: паводзяць сябе больш упэўнена, пачынаюць усміхацца. Як расказала майстар спорту па трохбор'і Марына Лаўнецкая, было шмат выпадкаў, калі хворыя людзі з дапамогай Жоры дасягалі добрых вынікаў. Адзін хлопец нават адмовіўся ад мыліц і прымаў удзел у спаборніцтвах сярод людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Між тым, сустракаюцца і такія, якія могуць падвесці ў самы адказны момант. Эбаніт якраз з іх ліку.

— Ён у нас усё жыццё толькі і займаецца тым, што падае надзеі, — смяецца дырэктар. — Дома ўсё па праграме выконвае. А вось на спаборніцтвах не заўсёды. Можа прайсці дыстанцыю але адмовіцца браць перашкоды. Спрабуем зразумець, чаму. Пасля выпрабаванняў, калі паўтараем заданне зноў, ён яго... выконвае. Але ж ад гэтага ўжо ніякай карысці няма. Ці не крыўдна пасля гэтага?

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

### Гараскоп ад Віктара Целяпушкіна

*За доўгі час працы з коньмі ён навучыўся разбірацца ў іх не горш чым у людзях. Прыгажосць, сіла, поспех, дасканаласць — якасці, уласцівыя гэтым жывёлам. І добра, калі яны прысутнічаюць у характары чалавека.*

*Наступны год, з пункту гледжання конніка, будзе вельмі спрыяльным для людзей адказных і працавітых. Каб дасягнуць добрых вынікаў, коні кожны дзень трэніруюцца. А пра іх сялянскіх суродзічаў і казаць нічога не трэба — і так зразумела, што яны працаголікі. Так што лайдакам, каб не сысці з дыстанцыі, трэба змяніць сваё стаўленне да жыцця.*

*Больш плённым будзе летні перыяд, бо ў коней гэтая пара года самая чаканая. Яны вельмі любяць свабоду, прастор — з ахвотай гуляюць на беразе Дняпра, шчыра радуюцца жыццю, сонейку.*

*Гаспадар года з разуменнем ставіцца да аматараў ласункаў. Але тым, хто любіць паесці, трэба яшчэ раз перачытаць павучальную гісторыю пра Заліма. І пажадана цукеркі часцей мяняць на моркву і яблыкі. Не так накладна для кішэні і для здароўя больш карысна.*

*І галоўнае, вельмі пашанцуе тым, хто знойдзе ў гэтым годзе сваю «палавінку». На стайні ёсць парачка, якая жыць адно без другога не можа. Нават іх так званыя «апартаменты» па суседстве знаходзяцца. Коннікі кажуць: калі іх развесці на больш далёкую адлегласць, яны такі «крык» падымуць! А так перагаворваюцца сабе цераз перагародку і чакаюць сустрэчы на вуліцы. Там яны заўжды разам.*

*Дарэчы, конны манеж можа стаць добрым месцам для знаёмства. Віктар Целяпушкін гэта можа аўтарытэтна пацвердзіць, бо са сваёй каханай ён сустрэўся менавіта ў коннай секцыі. Можа, трэба ўзяць гэты прыклад на ўзбраенне?*

# ТРЫ СЕКУНДЫ, ДВА САНТЫМЕТРЫ, АДЗІН УДАР...

«Звязда» падводзіць спартыўныя вынікі 2013 года і ўзгадвае самыя прыемныя падзеі ў айчынным спорце

**Яшчэ некалькі гадзін — і самы час узнімаць келіхі шампанскага за навагоднім сталом. Самы час дзякаваць родным і блізкім, жадаць ім здароўя, шчасця і іншых даброт. Прапаную о спіс адрасатаў прыемных пажаданняў уключыць і нашых спартсменаў. Тых, хто радаваў медалямі, тытуламі, рэкордамі, і асабліва тых, каму «трошкі не хапіла» — трох секунд, двух сантыметраў ці аднаго ўдару... Спорт — справа непрадказальная, таму хапала сёлета і допінгавых скандалаў, і закулісных інтрыг, і нечаканых паражэнняў. Але прапаную пакінуць усё гэта ў 2013-м, а новы год сустрэць з прыемнымі ўспамінамі.**

**1.** З усіх камандных відаў спорту **найбольш удалым год Змяі стаў для айчынных гандбалістаў.** Так, на чэмпіянаце свету хлопцы не змаглі прайсці далей за 1/8 фіналу. Але пасля сямнаццаці гадоў засухі і гэты вынік — «маленькі цуд». Затое на наступным адказным турніры падапечныя Юрыя Шаўцова зноў гучна заявілі пра сябе, трэці раз у гісторыі айчыннага гандбола здабыўшы пуцёўку на чэмпіянат Еўропы, які адбудзецца ў Даніі. Дарэчы, беларуская дружына трапіла ў адну групу з харватамі, шведамі і чарнагорцамі. Супернікі сур'ёзныя — барацьба будзе напружаная!

Узгадаем таксама нечаканы трыумф мінскага СКА. У маі падапечныя Спартака Міранoвіча сталі ўладальнікамі Кубка выкліку Еўрапейскай федэрацыі. Першая перамога беларускага гандбола ў Еўракубках больш чым за 20 гадоў!

**2.** У індывідуальных відах спорту таксама было за каго парадавацца. У самым пачатку года прыма айчыннага тэніса **Вікторыя Азаранка заваявала другі тытул Вялікага шлема** на Адкрытым першынстве Аўстраліі. Гэта быў драматычны і насычаны фінал, які дакладна зойме месца ў спісе самых феерычных тэнісных матчаў у гісторыі. Але сапраўдны цуд Вікторыя здзейсніла крыху пазней, калі ў фінальнай сустрэчы на турніры ў Досе ўпершыню з 2009 года абыграла сваю вечную саперніцу — амерыканку Сірэну Уільямс. А праз некалькі месяцаў паўтарыла гэты поспех, адабраўшы ў славутай спартсменкі запаветны тытул у Цынцынаці — адзіны турнір катэгорыі «прэм'ер», які пакуль не скарыўся малодшай з сясцёр Уільямс. Але гэта не проста гучныя перамогі, якіх доўга чакалі балельшчыкі беларускі... Яны — сімвалічныя. Новы віток у прынцыповым супрацьстаянні — барацьба за лідарства ў сусветным тэнісе, бітва пакаленняў, калі хочаце! Хіба не цікава будзе назіраць за развіццём гэтага саперніцтва ў новым годзе?



Фота БЕЛТА

**3.** Няпоўнай была б спартыўная палітра эмоцый без яшчэ адной яскравай перамогі. **Упершыню за 15 гадоў беларускія «грацыі» выйгралі «золата» чэмпіянату свету!** То была сапраўдная сенсацыя планетарнага першынства ў Кіеве. Беларуская дружына ў складзе Валерыі Пішчэлінай, Ганны Дудзянковай, Марыны Ганчаровай, Марыі Кацак, Аляксандры Наркевіч і Яны Лукавец беспамылкова адпрацавала праграму, амаль на бал апярэдзіўшы італьянак. Яшчэ большай была перавага над расіянкамі, спыніць гегемонію якіх у мастацкай гімнастыцы падобна подзвігу. Падапечных Таццяны Нянашавай (ды і ўсю беларускую дэлегацыю!) у мінскім аэрапорце сустракалі як народных герояў. А тыя, як і належыць сапраўдным героям, сціпла прымалі віншаванні і казалі, што чакаюць яшчэ аднаго цуду — адкрыцця Палаца мастацкай гімнастыкі. Дарэчы, падзея гэта запланавана на 2014 год... Чакаем.

**4.** А яшчэ **ў 2013 годзе наша краіна прымала два прэстыжныя турніры — чэмпіянат свету па веласпорце на трэку і чэмпіянат Еўропы па боксе.** І няхай беларускія атлеты не сабралі вялікі медальны ўраджай на хатніх стартах — гэта ж не галоўнае. Арганізацыю спартыўных форумаў не хваліў толькі лянівы. Маўляў, шыкоўная інфраструктура, выдатнае абслугоўванне, а людзі якія гасцінныя! Замежныя спартсмены і трэнеры пакідалі Беларусь з усмешкай на вуснах і лёгкім сумам у сэрцах, а функцыянеры абяцалі абавязкова вярнуцца. Перад галоўнай спартыўнай падзеяй наступнага года — чэмпіянатам свету па хакеі ў Мінску — безумоўна, важна было атрымаць прызнанне замежных гасцей. Што ж... цяпер можна не сумнявацца: беларуская сталіца на некалькі тыдняў гатова стаць домам для шматлікіх аматараў хакея з розных куткоў свету. А калі б яшчэ і нашы хакеісты апынуліся на п'едэстале!.. Зрэшты, у навагоднюю ноч можна загадваць любыя жаданні.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

# ЛЬВЫ — НА КАНІ, А ШАЛІ — НА КАЧАЛЦЫ




## ШТО ПРАДКАЗВАЮЦЬ ЗОРКІ Ў 2014 ГОДЗЕ?

**Паводле ўсходняга календара, які, здаецца, усё больш уплывае на еўрапейцаў, 2014 год пройдзе пад знакам Сіняга (па іншых крыніцах, Зялёнага) драўлянага Каня.**
**«Галоўная стыхія года — дрэва — сімвалізуе мудрасць і моцную сям'ю,— нагадвае астролаг і нумаролаг Аліна ВОЛКАВА,— а конь — сімвал не проста руху, але і магчымасці самому выбраць кірунак. Таму наступны год паспрыяе тым, хто гатовы вырвацца з паўсядзённай марнасці і штосьці змяніць у жыцці, магчыма, нават радыкальна. Праўда, гэта не датычыцца грошай: вы ж памятаеце, што конныя скачкі — справа непрадказальная? Таму ў фінансавых справах лепш сэканоміць, чым рызыкнуць, а ў міжасобасных — праявіць больш цярпення, чым эмацыянальнасці».**

**АВЕН** (21.03–20.04)



Першую палову года тыповыя прадстаўнікі гэтага знака павінны будуць правесці ў справах, якія запатрабуюць шмат фізічных і маральных высілкаў. «Ламавы конь» — на зіму-вясну гэта будзе пра вас. Затое ўжо летам працы ўсё, што вы пасеялі, прынясе плён. Наступны год наогул прадракае шанцаванне і поспех у рэалізацыі самых амбіцыйных вашых задумак — але, яшчэ раз паўторымся, пры ўмове вашай жа ўласнай актыўнасці.

Асцярожнымі Авенам варта быць з выказваннем уласнай думкі, асабліва ў коле блізкіх людзей і пры стасунках з кіраўнікамі. Нават калі вы на сто адзін працэнт упэўнены, што менавіта ваша меркаванне — самае правільнае, усё ж лепш трымаць яго пры сабе, каб не марнаваць нервы і пазбегчы вялікай колькасці канфліктаў.

**ЦЯЛЕЦ** (21.04–21.05)



Год абяцае быць не проста насычаным, а звышперамянлівым, непастаянным і бурлівым, як штармавое мора. Прычым пераважна з-за вашай жа звычкі хапацца за некалькі спраў адразу і не даводзіць ніводнай з іх да канца. Планы — планамі, але вы хоць бы папярэдні чарцяжы і разлікі рабіце, перш чым кідацца ў чарговую авантуру. Тым з прадстаўнікоў знака, хто здолее пераадолець гэтае памкненне разарвацца на сто маленькіх цялят і справіцца з уласнай раздражнёнасцю, пад восень усё ж пашанцуе ў справах.

Але гэта не значыць, што ўвесь астатні год трэба сядзець склаўшы рукі. Паспрабуйце працаваць у камандзе (і не настойваць на капітанскім чыне, вучыцца супрацоўнічаць вам карысна) — самі здзівіцеся, якія горы можна зрушыць грамадой! У прыватнасці, у калектыве вы здолееце рэалізаваць нейкі маштабны праект, да якога ў папярэдні год баяліся нават падступіцца.

**БЛІЗНЯТЫ** (22.05–21.06)



Большасць прадстаўнікоў гэтага знака на ўвесь год нібыта перatворыцца ў добрых чараўнікоў і фей, мімаходзь дапамагаючы далёкім і блізкім людзям справіцца з самымі рознымі праблемамі. Сусвет у адказ будзе лашчыць і песціць Блізнят, як толькі можна: карысныя знаёмствы, рамантычныя стасункі і ўдалыя перамовы са спонсарамі — усё ў іх будзе атрымлівацца!

Адзіная заўвага: робячы добра направа і налева, а таксама здзяйсняючы свае жаданні, разлічвайце сілы, інакш прыкладна ў кастрычніку-лістападзе назапашаная стомленасць можа выліцца ў сур'ёзныя праблемы са здароўем.

**РАК** (22.06–22.07)



Вы хочаце жыць заможна? Зразумела: хто ж не хоча! Але толькі Ракам — дый тое не ўсім без разбору, а дзелавітым і ўпартым, якія ведаюць, чаго хочуць, і гатовы ісці да сваёй мэты, не адцягваючыся на дробязі,— у 2014 годзе зоркі дадуць для гэтага ўсе магчымасці. Многім з вас давядзецца расставіць прыярытэты паміж сям'ёй і кар'ерай. І тут галоўнае ведаць, што праца, нават самая цікавая і прыбытковая, мае здольнасць завяршацца, а родныя людзі застаюцца побач заўсёды…

Зімой у некаторых Ракаў можа адбыцца папаўненне ў сям'і, прычым неабходныя для гэтага сродкі і рэсурсы чароўным чынам з'явяцца незалежна ад вас. Наогул, напрыканцы года ўсе вашы ўклады прынясуць свае вынікі, і нечаканых сюрпрызаў тут даклад- на не будзе.

**ЛЕЎ** (23.07–23.08)



Калі нехта яшчэ сумняваўся, што менавіта Львы — цары прыроды, налета вы здолееце гэта пацвердзіць уласным прыкладам. Ваш імпэт і імкненне да лідарства ў спалучэнні з мэтанакіраванасцю і ўменню «паляваць» на поспех столькі, колькі спатрэбіцца, будуць узнагароджаны як след. Часам складана будзе разабрацца, дзе вы самі дасягнулі ўдачы, а дзе яна вас падвезла на карку — але перамога ў любым выпадку будзе за вамі. Асабліва ярка гэта праявіцца ў першай палове года, калі ў вас будзе атрымлівацца літаральна ўсё, да чаго дайшлі рукі і галава. Толькі не забывайцеся на важнае правіла: хто добра працуе, павінен і добра адпачываць.

Вельмі карысным будзе ў 2014 годзе атрымаць новыя веды і ўменні, якія надалей вам абавязкова спатрэбяцца. Няблага пацікавіцца і псіхалогіяй, каб у пагоні за ўдачай не пакрыўдзіць неасцярожнымі словамі і рэзкімі рухамі кагосьці з блізкіх.

**ДЗЕВА** (24.08–23.09)



Прадстаўнікам гэтага знака ў 2014 годзе трэба будзе вырашыць няпростую задачу: альбо вы — сціплыя ды непрыкметныя працаўнік, цяглавы конь («хто вязе, на тым і возяць»), альбо ўсё ж Пегас, які ў палёце і сам дасягае зайздросных вяршыняў, і іншых натхняе на творчыя пошукі. У першым варыянце шмат магчымасцяў можа сплыць з вашых рук, у другім — для дасягнення поспеху спатрэбіцца заклікаць на дапамогу вашу славутую дысцыплінаванасць і самаарганізацыю. Не разменьвайцеся на дробязі і пачынайце ўжо адмаўляцца рабіць для іншых і за іншых «за дзякуй» насамрэч складаныя рэчы.

Калі ж вы адчуваеце, што сіл на вялікія справы не хапае, можна абраць іншы шлях — выйсці з натоўпу і проста пражыць гэты год, робячы тое, што вам насамрэч падабаецца. Для кагосьці гэты выбар прынясе нашмат больш карысці, чым забег невядома куды.

**ШАЛІ** (24.09–23.10)



Наступны год не прынясе Шалям вялікага задавальнення — але не таму, што будзе сапраўды няўдалым. Проста ваша патрабавальнасць да сябе і навакольных вырасце, як ніколі раней. Не плануйце абавязкова да абеду абвясціць вайну Францыі, зрабіць навуковае адкрыццё ці вывучыць тры мовы за год — выстаўляйце рэальныя мэты і спакойна рухайцеся да іх. Гэта зберажэ час, нервы і здароўе. Наогул, зоркі не рэкамендуюць нічога крута мяняць — самым лепшым транспартам для вас будзе не скакавы конь, а конь-качалка.

Толькі ў другой палове года знойдзецца выйсце для вашай вірлівай энергіі — магчымы новыя знаёмствы, перспектыўныя праекты, цікавыя спаборніцтвы, вандроўкі... Не адмаўляйцеся ад гэтых падарункаў лёсу: наступныя могуць з'явіцца яшчэ не вельмі хутка.

**СКАРПІЁН** (24.10–22.11)



Калі вы не ўмееце танцаваць, самы час навучыцца: у 2014 годзе ўменне захоўваць раўнавагу ў самых складаных па і лавіраваць, не адціскаючы ногі партнёрам, будзе вельмі дарэчы. Па-першае, вы зможаце завесці шмат карысных знаёмстваў. Па-другое, калі з кімсьці знайсці агульную мову не ўдасца і давядзецца ўступаць у канфрантацыю, вы здолееце вельмі спрытна абысці вострыя вуглы і, хутчэй за ўсё, выйдзеце пераможцам з любых канфліктаў.

Лета зоркі раяць прысвяціць адпачынку: накіруйцеся кудысьці, дзе шмат сонца, свежага паветра і вады — усё адно трэба будзе аднавіць сілы. Дарэчы, у гэты ж час можна здзейсніць пераезд, калі ён быў запланаваны. А восень бліжэй да дня нараджэння вас зноў напоўніць энергія, прычым, што немалаважна, стваральная.

**СТРАЛЕЦ** (23.11–21.12)



Самы час прымяніць сабе на карысць такія ўласцівасці характару, як воля да перамогі, мэтанакіраванасць і нават жорсткасць — інакш канкурэнтаў, як у бізнесе, так і ў каханні, абысці не ўдасца. Уменне разгледзець нечаканае ў відавочным таксама спатрэбіцца для прынята нестандартных, але дзейсных рашэнняў. Толькі не чакайце, што хтосьці, акрамя вас, давядзе іх да канца: усё трэба будзе рабіць самому. Магчыма, імпэту вам хопіць нават пабудаваць дом.

Важная дэталь: прадстаўнікам гэтага знака паказаны рух не рэзкі, але паступовы. І нічога, калі вы будзеце доўга запрагаць і рушыце з месца пазней за астатніх. Галоўнае — хто ў якім стане дабярэцца да фінішу.

**КАЗЯРОГ** (22.12–20.01)



Душэўны камфорт, прадуманая актыўнасць і ўменне знаходзіць ва ўсім станоўчыя бакі — усё гэта прадракаюць вам зоркі ў 2014 годзе. Прыкладна да лета не варта спяшацца з любымі пераменамі ў жыцці, а пры выбары паміж наватарскімі рашэннямі і традыцыйнымі метадамі лепш аддаваць перавагу апошнім, тады вы не расчаруецеся ў выніках. А вось у другой палове года ўсё будзе з дакладнасцю наадварот: нібыта раскруціцца нябачная спружына і падзеі будуць змяняць адна другую з шалёнай хуткасцю. Таму і вам давядзецца, каб паспець за імі, бегчы хутчэй за ўласны цень. Балазе, сіл і рэсурсаў на гэта хопіць.

Не адкладвайце важных планаў на снежань: у гэты час вам трэба будзе адпачыць і падсілкаваць уласную энергетыку. Напрыклад, у падарожжы.

**ВАДАЛЕЙ** (21.01–20.02)



Звычайна прадстаўнікі гэтага знака на кожным кроку трапляюць у нейкую гісторыю, але ў наступным годзе разнастайныя казусы і прыгоды будуць самі знаходзіць іх. Што, зрэшты, не выключае магчымасці спакойнага жыцця — калі не змагацца з цячэннем, а разняволіцца і атрымліваць задавальненне ад усяго, што з вамі адбываецца.

Адзінае, што ад вас патрабуецца, — старанна і прыдзірліва, да дробязяў, кантраляваць выкананне важных спраў. Карацей, калі хочаце, каб яны былі выкананы на належным узроўні, зрабіце самі, нікому не перадаручаючы. Тады і ўласныя сілы на крытыку іншых не змарнуеце, і заслужаную пахвалу (а таксама матэрыяльны стымул да яе) атрымаеце. У матэрыяльным плане, дарэчы, Вадалеям наогул непакоіцца не давядзецца: усе іх ранейшыя ўнёскі налета прынясуць дывідэнды. Магчыма таксама атрыманне спадчыны, павышэнне заробку, а можа, і выйгрыш у латарэю.

**РЫБЫ** (21.02–20.03)



Наступны год для вас пройдзе дакладна паводле прынцыпу зебры: чорная паласа будзе змяняцца белай, узлёты — падзеннямі, пасіўнасць — успышкамі энтузіязму. Першая з чорных палос працягнецца прыкладна да вясны, і тут галоўнае вам самім не пагаршаць сітуацыю як у міжасобасных стасунках, так і на працы, у вучобе і г.д. Тым больш што прадэманстраваць свае здольнасці вы зможаце ўжо вясной і летам, калі ваша неацэнная дапамога спатрэбіцца самым розным людзям — ад сваякоў да кіраўніцтва.

Увосень не разменьвайцеся на дробязі і не паглыбляйцеся з галавой у гаспадарчыя справы: можаце праспаць што-небудзь вельмі цікавае. Перспектыўных магчымасцяў побач праплыве даволі шмат — хапайцеся за самыя цікавыя з іх і настойліва рухайцеся да мэты, тады вам абавязкова пашанцуе!

«І не забывайцеся: каб добра правесці год, трэба як мінімум сустрэць яго з пазітыўным настроем,— падкрэслівае Аліна Волкава.— А «на кані» зможа апынуцца кожны, хто праявіць дастаткова настойлівасці ў дасягненні мэт».



**Мікалай АПІЁК,**
**заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, кіраўнік студыі ваенных мастакоў:**

*— Паважаныя чытачы «Звязды»! Сардэчна віншую вас з новым 2014 годам! Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў і шчасця! Няхай родная газета на роднай мове і далей асвятляе ваш шлях. Чытаючы «Звязду», я зноў узгадваю слаўныя вынікі былых баёў і радасць пераможных дзён вайны. Нам — тым, хто застаўся ў жывых, — лёсам наканавана расказваць пра іх.*

# «З НОВЫМ ГОДАМ!»

Склаў Іосіф КАРПЫЗА, г. Ляхавічы



**Па гарызанталі: 5.** Якасць, якой павінен валодаць завадатар калядных вечарынак. **6.** Гераіня казкі Х. Андэрсена «Снежная каралева». **11.** Слаісты пірог з яблыкамі — традыцыйная страва ў навагоднім меню чэхаў і славакаў. **12.** Аўтар песні «Завіруха». **17.** Царкоўнае песнапенне ў пахвалу свята. **18.** Дзіцячая знаходка пад навагодняй ёлкай. **19.** Жаночае футравае паліто. **22.** Печ, у якой, згодна са звычаем, у еўрапейскіх краінах спальваюць вялікае каляднае палена. **23.** Заключная частка святочнага прадстаўлення. **24.** Снежная бура. **27.** Востраў у Міжземным моры, дзе Дзеда Мароза завуць Васілём. **28.** Распараджэнне Пятра І, якое паклала пачатак традыцыі на Русі святкаваць Новы год 1 студзеня. **29.** Першы месяц старажытнарымскага календара. **30.** Аліўкавы тлушч, што выкарыстоўваецца ў царкоўным ужытку. **33.** Саначны схіл на радасць дзецям. **34.** Жанр твора А. Астроўскага «Снягурачка». **37.** Установа, дзе Дзед Мароз асабліва жаданы госць. **42.** Стваральнік зборніка народных пацешак «Ладачкі-ладкі». **43.** Паказ мадэляў адзення, што наладжваюць французскія краўцы ў калядныя святы. **44.** Свойская птушка, якую абавязкова гатуюць на Новы год у Даніі. **48.** Месца, дзе напярэдадні Новага года любіў сустракацца з сябрамі Жэня Лукашын — галоўны герой фільма «Іронія лёсу, ці З лёгкай парай». **49.** Паўночны вецер; калі ён дзьмуў на Васіле, чакалі халоднага з градам лета. **51.** Вядомы фалькларыст, стваральнік першага на Беларусі сістэмазаванага выдання па народным календары. **52.** Снежная няезджаная і няходжаная прастора.

**Па вертыкалі: 2.** Жывёліна — адзін з сімвалаў у дванаццацігадовым цыкле ўсходняга календара. **3.** Пара зімовага палявання. **7.** Пшанічны хлеб, які малдаване ставяць на калядны стол разам з куццёй. **8.** Плод, што румынскія гаспадыні запякаюць у якасці сюрпрызу ў навагоднім пірагу. **9.** Перадсвяточны гандаль елкамі пад адкрытым небам. **10.** Святая, якую беларусы ўшаноўваюць 18 лютага як ахоўніцу ад пажару. **13.** Беларускі класік, што апазтызаваў калядны рытуал у паэме «Новая зямля». **14.** Самы зручны транспарт для Дзеда Мароза. **15.** Краіна ў Цэнтральнай Амерыцы, жыхары якой лічаць сімвалам дабрабыту, шчаслівага сямейнага ачага вінаградную лазу. **16.** Адгароджанае месца ў свірне, клеці для захоўвання збожжа, мукі. **20.** Шасцітыднёвы пост перад Калядамі. **21.** Атрыбут маскараднай амуніцыі «дзеда» — удзельніка абрадавага калляднага шэсця. **25.** Гарнальны маршрут. **26.** Насельніцтва гэтай афрыканскай краіны лічыць талісманам Новага года недаспелы арэх. **31.** Спаборніцтва на хуткасць у біятлоніце. **32.** Жывёліна, якую запрагае ў сані амерыканскі Санта-Клаус. **35.** Плод з ядомым ядром у цвёрдай абалонцы; нямецкія гаспадыні падаюць яго на святочны стол разам з яблыкамі, разынкамі і пірагом. **36.** Сімвал хрысціянскай веры. **38.** Галаўны ўбор вышэйшага духавенства, які надзяваецца ў час набажэнства ў праваслаўнай і каталіцкай царкве. **39.** Вечная загадка для дзяцей: калі гэта Дзед Мароз паспявае паклaсці падарунак пад ёлку? **40.** Месяц у апошняй квадры, на зыходзе. **41.** Моўны зварот Дзеда Мароза. **45.** Неабходная прыналежнасць маскараднага касцюма. **46.** Рускі класік, аўтар навагодняга апавядання «Лібераl».

**Па дугах: 1.** Дэсертнае віно. **4.** Пацяпленне пасля марозу. **47.** Асвяжальны фруктовы напітак. **50.** Прыправа з агародніны, круп для рыбных і мясных страў.

**ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 5. Гумар. 6. Герда. 11. Рулет. 12. Ханок. 17. Канон. 18. Падарунак. 19. Манто. 22. Камін. 23. Фінал. 24. Завея. 27. Кіпр. 28. Указ. 29. Марс. 30. Алей. 33. Горка. 34. Казка. 37. Школа. 42. Вітка. 43. Катэрынет. 44. Індык. 48. Лазня. 49. Барэй. 51. Лозка. 52. Цалік. **Па вертыкалі:** 2. Пацук. 3. Сезон. 7. Калач. 8. Перац. 9. Базар. 10. Агата. 13. Колас. 14. Сані. 15. Куба. 16. Засек. 20. Піліпаўка. 21. Табакерка. 25. Траса. 26. Судан. 31. Гонка. 32. Алень. 35. Арэх. 36. Крыж. 38. Мітра. 39. Тайна. 40. Ветах. 41. Выраз. 45. Маска. 46. Чэхаў. **Па дугах:** 1. Мускат. 4. Адліга. 47. Крушон. 50. Гарнір.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.57 | 7.29 |
| Віцебск — | 9.26 | 16.39 | 7.13 |
| Магілёў — | 9.19 | 16.47 | 7.28 |
| Гомель — | 9.07 | 16.52 | 7.45 |
| Гродна — | 9.42 | 17.14 | 7.32 |
| Брэст — | 9.34 | 17.23 | 7.49 |

## Месяц

*Апошняя квадра 25 снежня 12 кастрычніка. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

**Пр.** *Зоі, Марка, Міхаіла.*
**К.** *Меланіі, Сільвестра.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# Мяжу перасякаў... Новы год

Брэсцкія вартавыя дзяржаўнай мяжы вырашылі адрадзіць добрую традыцыю — прапускаць праз мяжу Новы год. А паўдзельнічаць у прыгожай казцы, вядома, цікавей за ўсё дзецям. На гэты раз сведкамі амаль неверагоднай падзеі сталі два дзясяткі выхаванцаў Брэсцкага сацыяльнага прытулку. Менавіта для іх супрацоўнікі Брэсцкай памежнай групы наладзілі паездку ў рэзідэнцыю беларускага Дзеда Мароза. І ён, самы галоўны Дзед з Белавежскай пушчы, аддаў загад самаму сапраўднаму памежнаму нарадy:

— Новы год церaз мяжу прапусціць!

Пасля чаго Новы год важна прайшоў міма вайскоўцаў са зброяй і аўчаркай, міма памежнага слупа, які цудоўным чынам апынуўся ў гэты дзень у маёнтку Дзеда Мароза. Вядома, былі ў гэты дзень падарункі, сустрэчы з насельнікамі зімовага царства Дзядулі Мароза. А яшчэ дзеці даведаліся шмат новага пра жыццё дзяржаўнай мяжы.

**Яна СВЕТАВА.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі вы да гэтага часу не ведаеце, што падарыць каханай на Новы год, у вас яшчэ дастаткова часу, каб з'ехаць з краіны.**

— Міш-а-а-а! З Новым годам!
— Ваня-я-я! Адыдзі ад бярлогі!

**На Новы год купіла дзве машынкі на радыёкіраванні. Каб муж з дзіцем не пабіліся...**

1-е студзеня... Увечары ляжым з жонкай, глядзім тэлевізар. Яна, усміхаючыся, інтымным голасам мне кажа:

— Вось цяпер дзеці заснуць, ведаеш чым мы зоймемся?




Я увесь у прадчуванні чагосьці незвычайнага, пытаюся:

— Чым?

Яна нахіляецца і шэпча мне на вуха:

— Цукеркі з дзіцячых падарункаў будзем есці!

**Новы год.**
**— Добры дзень, Міша!**
**— Добры, Мікалай Канстанцінавіч...**
**— Адгадай загадку: «Не п'е, не курыць — на Новы год дзяжурыць!»**
**— Э-э-э... Гэта вы на што намякаеце?**

У сувязі з набліжэннем Новага года ў краіне праходзіць павальная мандарынізацыя насельніцтва.

**— Дарагі, я так хачу на Новы год футра!**
**— Мая ты гаспадыня! Заўтра ж пайду куплю бурак і селядца!**

Проста дадайце словы «І гэта, у год Блакітнага Каня...» да любога анекдота. І менавіта вас паклічуць быць тамадой на вяселле да генеральнага дырэктара.




**На пытанне дзіцяці «Дзядуля Мароз, а ты сапраўдны?» Дзед Мароз пачаў паказваць сертыфікаты, даведку з падатковай, ліцэнзію і часовую рэгістрацыю.**

— Мама, мама! Ёлка гарыць!
— Сынок, не гарыць, а зззяе.
— Мама, мама! Шторы ззяюць!

**«Дарагі Дзед Мароз, не кладзі мне падарунак пад ёлку, калі ласка. Заганяй яго адразу ў гараж».**

— Сярога са сваёй жонкай развоздзіца!
— А што здарылася?
— Падарыў ён ёй машыну на Новы год, гараж на 8-е Сакавіка, футра на гадавіну сямейнага жыцця. А яна яго ўчора выставіла за дзверы!
— Чаму?!
— Дык букет на дзень нараджэння не прынёс...

**Самае жудаснае ў апошнія дні перад Новым годам гэта тое, што ў халадзільніку поўна ежы, але яе нельга есці.**

— Дарагая, а што ты мне падарыш на Новы год? Сябе! А, ну вядома, год Каня ж!

**Адэса, Новы год, святочны стол. Са стала падае відэлец. Бацька сямейства, перакульваючы стол, ловіць відэлец за сантыметр ад падлогі.**



**— Фу, дзякуй Богу, больш ніякіх гасцей не будзе.**
**І тут у пакой уваходзіць дачка:**
**— Тата, тата! Цётка Соня ў ліфце «захрасла»!**

Пасля сустрэчы Новага года.
— Мадам, вы не маглі б паказаць мне дарогу дадому?
— Магу...
— А адкуль вы ведаеце, дзе я жыву? Мы што, з вамі знаёмыя?
— Маўчы, дурань! Я твая жонка!

**— Улетку 23% расіян адпачывалі на курортах, 18% — на дачы, 46% — не бралі адпачынак.**
**— А дзе яшчэ 13%?**
**— Працягвалі адзначаць Новы год!**

Шэраг свят мы пачалі адзначаць з гадавіны канца свету.

**— У Германіі Дзеда Мароза клічуць Санта-Нікалаусам, і падарункі ён кладзе ў абутак.**
**— Дык вось кім быў мой кот у мінулым жыцці!..**

— Чаму цяпер у снежні няма снегу?
— Дык ён увесь у красавіку гэтага года выпаў.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў несуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.398. Індэкс 63850. Зак. № 5571.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 снежня 2013 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12